Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

16 ВЕРАСНЯ 2016 г. ПЯТНІЦА № 179 (28289)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Накарміць трох чалавек за 10 рублёў**

СТАР. 4



**Піраміда з веласіпедаў**

СТАР. 13



**Праграма тэлебачання на тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Анатоль КАЛІНІН, намеснік прэм'ер-міністра Беларусі:**

*«Мы бачым сёння, што кошт квадратнага метра жылля, пабудаванага з дзяржаўнай падтрымкай, па першым паўгоддзі не перавышае Br760. Гэта той паказчык, які ўрад абавязаны кантраляваць, каб забудоўшчыкі не паднімалі цэны. Такіх падстаў няма, але штучна забудоўшчык можа гэту планку падняць. Мы стаім на варце інтарэсаў нашых людзей, якія набываюць жыллё. У плане будаўніцтва жылля ўрад цяпер робіць акцэнт на энергаэфектыўных дамах».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.09.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9574 | ▲ |
| Еўра | 2,1972 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0300 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0747 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# ГЕАМЕТРЫЯ ПРАЦЫ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**У будаўнічай арганізацыі са складанай назвай «Гомельаблдарбудкамплект» працуе выдатны газазваршчык Васіль СІВУХА. Без брыгадзіра, спецыяліста 6-га разраду, не абыходзіцца ніводная будоўля, звязаная са значнымі падзеямі ў розных гарадах краіны, — «Дажынкамі», Днямі беларускага пісьменства... Больш за 40 гадоў Васіль Андрэевіч прыкладае свае ўмелыя рукі да будаўніцтва аб'ектаў у малых і вялікіх паселішчах.**

■ Рэпарцёр

## БУЛЬБЯНАЯ ЭПАПЕЯ

### Затраты вялікія, а выгады — кот наплакаў

**У мінулыя выхадныя прыехала ў сваю родную вёску, што ў Баранавіцкім раёне на Брэстчыне. І адразу трапіла, так бы мовіць, з карабля на баль. Суседка Галя капала бульбу. Папрасіла дапамагчы. Ну як адмовіць: у дзяцінстве былі найлепшымі сяброўкамі, бегалі ў адну школу.**

СТАР. 4



■ Гонар краіны

## ІГАР БОКІЙ: ЗНОЎ «ЗОЛАТА»!

**Напярэдадні Ігар Бокій заваяваў ужо чацвёртае «золата» Параалімпіяды, якая праходзіць у Рыа. Цяпер беларускі плывец мае ўжо дзевяць (!) залатых медалёў галоўных форумаў планеты, яшчэ пяць разоў ён станавіўся найлепшым у Лондане чатыры гады таму.**



Трыумфальным для нашага параалімпійца стаў заплыў на 50 метраў вольным стылем у катэгорыі S13 (спартсмены з парушэннямі зроку). Ігар праплыў усю дыстанцыю за 23,44 секунды і ўстанавіў новы параалімпійскі рэкорд. Найбліжэйшымі пераследнікамі нашага плыўца сталі бразілец Карлас Фарэнберг (24,17) і ўзбек Музафар Турсунхаджаеў (24,21). Да гэтага беларус перамагаў у заплывах на 100 метраў батэрфляем, 200 метраў комплексным плаваннем і 400 метраў вольным стылем, а таксама заваёўваў бронзу ў дысцыпліне 100 метраў брасам.

Цяпер у беларускай скарбонцы Параалімпіяды шэсць залатых медалёў (акрамя Бокія чэмпіёнам сталі шпажыст-калясачнік Андрэй Праневіч і плывец Уладзімір Ізотаў) і два бронзавыя (Бокій і кідальнік кап'я Аляксандр Трыпуцць). У неафіцыйным медальным заліку Беларусь па стане на 15 верасня ідзе на 15 месцы. Лідзіруюць Кітай (75, 58, 39), Вялікабрытанія (43, 24, 28) і Украіна (31, 23, 27).

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

Звязда. Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

5 разоў на тыдзень!

Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# ПРЭЗІДЭНТ НАКІРАВАЎСЯ Ў БІШКЕК

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваўся з рабочым візітам у Кыргызстан, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Прэзідэнт прыме ўдзел у пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў — удзельніц СНД, якое адбудзецца 16 верасня ў Бішкеку.

Парадак дня пасяджэння ўключае каля 15 пытанняў. Лідары краін СНД разгледзяць рэалізацыю ў 2017 годзе міждзяржаўнай праграмы «Культурныя сталіцы Садружнасці» ў Азербайджане, праграму супрацоўніцтва ў барацьбе з тэрарызмам і іншымі гвалтоўнымі праявамі экстрэмізму на 2017—2019 гады, канвенцыю аб міжрэгіянальным супрацоўніцтве і іншыя пытанні.

Асаблівую ўвагу кіраўнікі дзяржаў звернуць на адаптацыю Садружнасці да сучасных рэалій.

Як чакаецца, на пасяджэнні будзе прыняты шэраг заяў, у тым ліку ў сувязі з 25-годдзем СНД.

# СТАЛІЦА ПА ГЕНПЛАНЕ

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ, які прадугледжвае карэкціроўку генеральнага плана Мінска з прылеглымі тэрыторыямі і некаторыя пытанні яго рэалізацыі.**

Асноўныя палажэнні новага плана горадабудаўнічага развіцця сталіцы да 2030 года актуалізуюць горадабудаўнічую палітыку тэрытарыяльнага развіцця і прагнозна-мэтавыя паказчыкі, уключаючы павелічэнне насельніцтва да 2 млн чалавек і жыллёвага фонду да 52 265 тыс. кв. м.

У новай рэдакцыі генеральным планам Мінска прадугледжваецца стабілізацыя колькасці насельніцтва і аптымізацыя аб'ёмаў жыллёвага будаўніцтва ў сталіцы ў межах існуючай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай мяжы сталіцы, якая вызначана як мяжа перспектыўнага развіцця Мінска да 2030 года, а таксама з улікам чаканага дэмаграфічнага прыросту расселенне 100-120 тысяч чалавек у гарадах-спадарожніках Мінска.

У адпаведнасці з генеральным планам будаўніцтва сацыяльна запатрабаванага жылля будзе працягнута на свабодных тэрыторыях. Комплексы жылой забудовы будуць ствараецца на вызваленых вытворчых тэрыторыях, а таксама на тэрыторыях зносу сядзібнай і малапавярховай забудовы з вялікім працэнтам фізічнага і маральнага зношвання.

Развіццё горадаўтваральнай базы Мінска будзе забяспечвацца ў выніку захавання горадабудаўнічага патэнцыялу 4,4 тыс. га тэрыторый, занятых прадпрыемствамі горада. Рэзерваванне каля 300 га вытворчых тэрыторый дазволіць стварыць працоўныя месцы ў новых жылых раёнах Нотынгем і Зялёны Бор.

Для стварэння спрыяльных умоў для жыцця і здароўя насельніцтва генеральным планам запланавана будаўніцтва новых гарадскіх і раённых паркаў на плошчы больш за 2 тыс. га. У склад прыродна-ландшафтнага комплексу сталіцы будзе ўключана каля 2 тыс. га лесапаркавых тэрыторый з паўднёва-ўсходняга боку Мінскага мора, што дасць магчымасць кампенсаваць дэфіцыт азелянення тэрыторый для жыхароў перыферыйных раёнаў горада.



Фота БЕЛТА.

Новая рэдакцыя генеральнага плана прадугледжвае фарміраванне эфектыўнай радыяльна-кальцавой структуры магістральных вуліц і дарог і ўдасканаленне сістэмы пасажырскіх зносін шляхам развіцця ўсіх відаў гарадскога і прыгараднага пасажырскага транспарту і стрымлівання аб'ёму руху легкавога аўтатранспарту. Прыярытэтнае развіццё атрымаюць рэйкавыя віды пасажырскага транспарту: метро, трамвай і чыгунка.

Указ таксама прадугледжвае распрацоўку горадабудаўнічага праекта спецыяльнага планавання на тэрыторыю, прылеглую да перспектыўнай гарадской мяжы да другой кальцавой аўтамабільнай дарогі вакол Мінска. Гэты праект вызначыць інтэнсіўнасць выкарыстання, функцыянальнае занаванне, іншыя рэгламенты горадабудаўнічага асваення, парадак узаемадзеяння Мінскім аблвыканкамам і Мінскім гарвыканкамам горадабудаўнічай дзейнасці.

# КАЛІ МЫТНЯ ДАЕ ДАБРО

**Далейшае развіццё эканомік дзяржаў СНД і павышэнне дабрабыту народаў шмат у чым залежаць ад глыбіні інтэграцыі ў сферы мытнай дзейнасці.**
**Пра гэта заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з удзельнікамі 64-га пасяджэння Савета кіраўнікоў мытных службаў краін — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў.**

За чвэрць стагоддзя існавання СНД была сфарміравана значная нарматыўная база мытнай справы, у чым асноўная роля належыць Савету кіраўнікоў мытных службаў, а таксама адпаведным нацыянальным органам, лічыць Аляксандр Лукашэнка. «Дастаткова назваць пагадненні аб стварэнні зоны свабоднага гандлю, аб супрацоўніцтве і ўзаемадапамозе ў мытных справах, мадэльны мытны кодэкс і шэраг іншых дакументаў. Яны будуюцца на базавых прынцыпах Сусветнай гандлёвай арганізацыі, якія ўключаюць у тым ліку і свабоду транзіту на тэрыторыі дзяржаў», — нагадаў Прэзідэнт.

У рамках Савета кіраўнікоў мытных службаў сфарміраваны Камітэт кіраўнікоў праваахоўных падраздзяленняў. Прэзідэнт назваў гэтую ініцыятыву своечасовай, паколькі менавіта мытная служба заклікана ў першую чаргу абараняць краіну ад кантрабандных тавараў, увозу наркотыкаў, а гэтае зло штогод адчуваецца ўсё ў большай ступені.

«Тэрытарыяльнае становішча Беларусі такое, што ў рамках Садружнасці значная частка нашай мяжы праходзіць з краінамі Еўрапейскага саюза. Сумесна з імі мы рэалізуем шэраг праграм па развіцці інфраструктуры на мяжы, забеспячэнні бяспекі, бесперашкодным перамяшчэнні тавараў. Скажу шчыра: хацелася б большага ўдзелу ЕС у мытных справах. Таму што як Расіі, так і Еўрасаюзу вельмі важная Беларусь, дзе тавары праходзілі б перш за ўсё транзітам, і па часе гэта было б мінімальна», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт асабліва падкрэсліў вялікую зацікаўленасць у перамяшчэнні праз Беларусь тавараў у напрамку Еўропы з краін Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёна. «У гэтым плане мы цалкам падтрымалі ініцыятыву старшыні КНР аб стварэнні эканамічнага пояса Шаўковага шляху, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Фарміруем у сябе буйныя лагістычныя цэнтры, у стварэнні якіх зацікаўлены не толькі КНР, Беларусь, нашы блізкія суседзі, але і аддаленыя краіны, якія знаходзяцца на гэтым транспартным шляху».

# УЗНАГАРОДЫ ПАРЛАМЕНТАРЫЯМ

**Група парламентарыяў і супрацоўнікаў сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі ўдастоена дзяржаўных узнагарод за плённую дзяржаўную і грамадскую дзейнасць, значны ўклад у развіццё заканадаўства і парламентарызму. Адпаведны ўказ падпісаў кіраўнік дзяржавы, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Ордэнам Пашаны ўзнагароджаны старшыня Пастаяннай камісіі па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы Сяргей Канопліч. Медаля «За працоўныя заслугі» ўдастоены старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Віталь Бусько, старшыня Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы Віктар Валюшыцкі, старшыня Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Генадзь Грыцкевіч, старшыня Пастаяннай камісіі па аграрнай палітыцы Віктар Шчэцька і іншыя дэпутаты.

У адпаведнасці з указам званне «Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь» прысвоена члену Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Аляксандру Папкову, званне «Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь» — старшыні Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Людміле Міхальковай.

## ■ Парламенцкі дзённік

# САЦЫЯЛЬНАЯ АРЫЕНТАВАНАСЦЬ ЗАХАВАЕЦЦА

## Фарміраванне бюджэту на наступны год абмяркоўваюць у Палаце прадстаўнікоў

**Учора адпаведнае пытанне разглядзела на пашыраным пасяджэнні Пастаянная камісія па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы. Дэпутаты асаблівую ўвагу звярнулі на магчымасць падатковага паслаблення для медыцынскіх установ.**

Па словах **Святланы ШЫЛАВАЙ, намесніка старшыні гэтай камісіі,** бюджэт, як і ў мінулыя гады, захоўвае сацыяльную накіраванасць. На сферу адукацыі выдаткоўваецца 113,5%, на сферу аховы здароўя — 118,5% (у параўнанні з бягучым годам).

— Гэта значыць, адлічэнняў з нашай сістэмы няма, затое ёсць рост, — канстатавала дэпутат, кажучы пра сістэму аховы здароўя. — Безумоўна, нас гэта радуе. Але гэты рост звязаны больш з высокатэхналагічнай медыцынскай дапамогай. Усё астатняе, напрыклад рост заработнай платы медработнікаў, будзе звязана толькі з аптымізацыяй колькасці работнікаў і пэўнымі перастаноўкамі ў сістэме аховы здароўя.

Парламентарый таксама прызналася, што медыцынскіх работнікаў вельмі турбуе падатковая нагрузка на даходы ад шэрагу платных паслуг, што аказваюць медыцынскія ўстановы.

— Было б добра, калі на гэтыя паслугі далі падатковае паслабленне. Мы будзем ставіць адпаведнае пытанне перад Міністэрствам фінансаў. Гэтыя сродкі могуць быць накіраваны на павышэнне зарплат, матэрыяльнае стымуляванне медыцынскіх работнікаў.

**Дэпутат Вадзім ДЗЕВЯТОЎСКІ, намеснік старшыні гэтай жа Пастаяннай камісіі,** паведаміў, што змяншаць фінансаванне сферы спорту таксама не плануецца:

— Міністэрства спорту адстаяла ўсе свае пазіцыі па бюджэце, і можна сказаць, што выдаткі на спорт не паменшыліся ў параўнанні з 2016 годам. Гэта не можа не радаваць. Мы бачым пералом у грамадстве ў цэлым, калі казаць пра тую працу, якая праводзіцца функцыянерамі Міністэрства спорту па масавых мерапрыемствах. Мы бачым, што ўсё больш людзей далучаецца да здаровага ладу жыцця, што вельмі важна.

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы і сацыяльных пытаннях Зінаіда МАНДРОЎСКАЯ** паведаміла, што ў дэпутатаў будуць пытанні да ўрада «па фарміраванні бюджэту, па яго напаўняльнасці, па тым, што, на жаль, дынамікі пакуль не назіраецца».

— Адпаведна, будуць пытанні па актывізацыі рэальнага сектара эканомікі для таго, каб сфарміраваць больш напоўнены бюджэт, — заявіла яна.

Таксама на пашыраным пасяджэнні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі абмяркоўвалі магчымыя змены ў сувязі з новымі законапраектамі. У абмеркаванні таксама ўдзельнічалі прадстаўнікі міністэрстваў энергетыкі, прамысловасці, транспарту і камунікацый. **Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Вольга ПАЛІТЫКА** адзначыла, што асноўная задача пры папярэднім разглядзе законапраектаў — падумаць не толькі пра тое, як эканоміць, але і знайсці спосаб зарабляць дадатковыя рэсурсы. «Нам трэба больш развіваць наш рэальны сектар эканомікі. Мы хочам сканцэнтравацца на тых зменах у падатковым заканадаўстве, якія будуць насіць стымулюючы характар, а не толькі фіскальны. З прадстаўнікамі міністэрстваў мы абмяркоўваем тое, якія захады і сродкі трэба выкарыстоўваць, каб стымуляваць развіццё галін. Эканомія сёння важная. Але больш важнае эфектыўнае выкарыстанне сродкаў», — патлумачыла дэпутат.

Члены Пастаяннай камісіі ўжо бачаць шэраг напрамкаў стымулявання прамысловага комплексу на 2017 год. Як і раней, прыярытэтнай задачай застаецца падтрымка экспарцёраў. Нягледзячы на тое, што кожны год зніжаюцца меры дзяржаўнага крэдытавання, дзяржпадтрымка ўсё яшчэ прадугледжана ў праекце закона аб бюджэце налета. Сюды можна аднесці і кампенсацыю працэнтаў па крэдытах.

Адной з найбольш вострых тэм абмеркавання Пастаяннай камісіі ў рамках фінансавання транспартнага комплексу стала пытанне ўтрымання і рамонту дарог. Дэпутаты адстойваюць размеркаванне дзяржаўнай пошліны, якая спаганяецца за выдачу дазволу на допуск транспартнага сродку да ўдзелу ў дарожным руху ў выглядзе 50% на адлічэнні ў рэспубліканскі бюджэт і 50% у мясцовыя бюджэты. **Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Яўген АБАЛЕНСКІ** растлумачыў, што толькі ў першы год гэтыя ўмовы выконваліся, а потым назіраўся дыспарытэт, які сёння дайшоў да ўзроўню 39% адлічэнняў сродкаў у мясцовыя бюджэты. «Атрымліваецца, што кіроўцы плацяць і не бачаць выніку на мясцовых дарогах, бо далёка не кожны з іх часта ездзіць па МКАД. Мы хочам адстаяць размеркаванне дарожных пошлін у выглядзе 50/50, каб больш рэсурсаў ішло на мясцовыя дарогі і каб грамадзяне гэта адчувалі. Такое размеркаванне бачыцца шэрагу дэпутатаў больш справядлівым», — адзначыў Яўген Абаленскі.

Таксама дэпутаты лічаць, што праблема непраходжання дзяржтэхагляду тычыцца размеркавання сродкаў, што паступаюць ад выплаты пошліны.

«Дзяржпошліна на допуск транспарту да дарожнага руху, якая выплочваецца пры праходжанні дзяржтэхагляду, несувымерна большая, чым штраф за яго адсутнасць. Нядобрасумленныя вадзіцелі палічылі больш мэтазгодным не праходзіць тэхнічнага агляду і не плаціць пошліны, а заплаціць штраф. Таксама ёсць думка, што варта адвязаць праходжанне тэхагляду і дзяржпошліну і асобна трэба прапрацаваць льгатаванне некаторых катэгорый грамадзян — пенсіянераў і маламаёмных», — расказаў Яўген Абаленскі.

Акрамя таго, на думку дэпутатаў, неабходна больш дэталёва абмеркаваць скарачэнне аб'ёмаў фінансавання капітальнага рамонту дарог. Капрамонт, нягледзячы на вялікія выдаткі ў параўнанні з бягучым (ямачным), з'яўляецца больш эфектыўным і рацыянальным. Чакаецца, што ў 2017 годзе на фінансаванне капітальнага рамонту дарог будзе выдзелена ў 2 разы менш сродкаў, чым гэта было ў 2016 годзе.

Сацыяльная накіраванасць пры фарміраванні бюджэту на 2017 год дазволіць забяспечыць рост выдаткаў на ахову здароўя і адукацыю больш высокімі тэмпамі. Паводле слоў **намесніка міністра фінансаў Юрыя СЕЛІВЕРСТАВА,** падчас пашыранага пасяджэння Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах, на якім разглядаліся праекты законаў «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Падатковы кодэкс» і «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2017 год», адлічэнні з бюджэту на гэтыя мэты павялічацца на 18,5% і 12,1% адпаведна. А гэта высокія паказчыкі ў параўнанні з іншымі сферамі. Таксама намеснік міністра падкрэсліў, што рост фонду аплаты працы бюджэтнікаў запланаваны ў памеры 9%. Павелічэнне заробкаў у бюджэтнай сферы можа быць забяспечана за кошт аптымізацыі як занятых, так і сеткі бюджэтных арганізацый.

Што тычыцца стаўкі рэфінансавання, то ў 2017 годзе яна запланавана на ўзроўні 15—17%. Згодна з базавым сцэнарыем сацыяльна-эканамічнага развіцця, прынятым пры фарміраванні бюджэту, тэмп росту ВУП налета складзе 100,2%.

Падатковая палітыка не прадугледжвае істотных змен. Падатковая нагрузка знізіцца з 24,6% да 23,9—24%. Даходы рэспубліканскага бюджэту плануюцца ў аб'ёме 18,2 млрд рублёў, што складзе 106,1% да цяперашняга года, выдаткі — 16,7 млрд рублёў — 99% да 2016 года.

На фінансаванне будаўніцтва жылля плануецца накіраваць каля 3,8 млрд рублёў. Па ўсёй краіне ў будучым годзе плануецца пабудаваць не менш за 3 млн кв.м жылля.

Пры фарміраванні праекта бюджэту налета ўлічваўся цяперашні кошт расійскага газу. Акрамя таго, пры падрыхтоўцы праекта бюджэту ўлічвалася і цяперашняя стаўка вызваной мытнай пошліны на калійныя ўгнаенні — 55 еўра за тону.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*
**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

■

■ Ці чулі?!

# КНІГА, ДЗЕ ТВОЙ ДОМ?

## У кантэйнеры для непатрэбных выданняў знайшлі каштоўныя старадрукі

**У дзень бібліятэк, 15 верасня, Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі кампаніяй «Белгіпс Эка» былі перададзены каштоўныя старыя кнігі. Некаторыя сродкі масавай інфармацыі паведамлялі, быццам рарытэты былі знойдзены... у макулатуры. Карэспандэнт «Звязды» высветліла, ці з'яўляецца праўдзівай такая версія?..**

Кампанія «Белгіпс Эка» сапраўды займаецца зборам другаснай сыравіны, у прыватнасці макулатуры. Але ў той жа час там рэалізуецца праект «Падары кнізе другое жыццё», які мае сацыяльную накіраванасць. Вялікія зялёныя скрыні акурат з такім надпісам можна ўбачыць па ўсёй сталіцы. Туды трапляюць кнігі, якія ўжо не надта патрэбны сваім уладальнікам. Іх пераразмяркоўваюць у розныя арганізацыі, якія могуць мець у гэтым патрэбу, — хоспісы, дзіцячыя дамы, бібліятэкі.

Падчас чарговага збору выданняў знайшлі кнігі, якія нават вонкава сведчылі пра сваю каштоўнасць. Супрацоўнікі кампаніі адразу звярнуліся ў Нацыянальную бібліятэку па экспертызу. Там пацвердзілі, што некаторыя з выданняў маюць выключную каштоўнасць. Гэта, напрыклад, «Псалтыр» з Кіева 1888 года выдання, поўны збор твораў Гогаля ў адным томе 1921 года выдання. А самым каштоўным выданнем аказаўся падручнік па маральнай тэалогіі, надрукаваны ў сярэдзіне XVIII стагоддзя ў Вільні тамтэйшымі піярамі. На той час манахі-піяры былі лідарамі ў адукацыйнай дзейнасці і рыхтавалі найлепшыя падручнікі па розных галінах навук.

— Гэта вельмі рэдкае і каштоўнае выданне, — адзначае **намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Алесь СУША**. — Яно тым больш важнае, што раней такой кнігі ў фондах не было. Папершае, яна лічыцца нацыянальным дакументам — была надрукавана ў Вільні, якая для Беларусі з'яўляецца адной з культурных сталіц. Па-другое, кніга два стагоддзі знаходзілася на беларускіх землях, пераходзіла з рук у рукі — адпаведныя пазнакі змяшчаюцца на старонках. Яна была ў руках ніжэйшага каталіцкага духавенства, спачатку ў Вільні, а затым у Будслаўскім манастыры бернардзінцаў. Мы, на жаль, не можам устанавіць, кім былі яе ўладальнікі ў XIX і XX стагоддзях. Многія пазнакі на кнізе яшчэ не расшыфраваныя — магчыма, яны дапамогуць праліць святло на гэта пытанне.

Такое здарэнне ў нечым выпадковага папаўнення фондаў старадрукамі не адзінкавае. Раней рэгулярна праходзілі



археаграфічныя экспедыцыі — калі супрацоўнікі бібліятэкі накіроўваліся ў далёкія рэгіёны краіны. Напрыклад, на Віцебшчыну, дзе жылі стараверы і захоўвалі шмат старых выданняў, рукапісаў. Яны самі ці іх нашчадкі часта прапаноўвалі аддаць старажытныя кнігі. Часам спадчыннікі пасля смерці бацькоў прыносяць і пакідаюць у бібліятэцы каштоўныя рарытэты, якія раней належалі іх сям'і.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ**

■ Надвор'е

## Вось і першыя начныя замаразкі

**Сёння ўдзень надвор'ем у нашай краіне будзе кіраваць малаактыўны франтальны падзел, а ў паўднёва-заходніх раёнах краіны захаваецца ўплыў вобласці павышанага атмасфернага ціску, паведамляюць спецыялісты Белгідраметцэнтра.**

Чакаецца пераменная воблачнасць. Удзень месцамі па паўночна-ўсходняй палове краіны пройдуць невялікія кароткачасовыя дажджы. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе плюс 14—20 градусаў, а па паўднёвым захадзе краіны — да 21—24.

Сіноптыкі адзначаюць, што ў суботу і нядзелю характар надвор'я будзе вызначаць скандынаўскі антыцыклон, сфарміраваны ў халоднай паветранай масе. Істотных ападкаў не чакаецца. Уначы і раніцай месцамі туман. Тэмпература паветра ўначы на суботу знізіцца месцамі да 3—10 цяпла, а максімальная ўдзень будзе дасягаць плюс 12—19 градусаў, па паўднёвым захадзе — 20—22 цяпла. У нядзелю стане яшчэ свяжэй, калі ўначы мінімальная тэмпература паветра будзе дасягаць толькі 2—9 цяпла, а на глебе месцамі прагназуюцца слабыя замаразкі да 0 — мінус 2 градусаў. Праўда, удзень будзе яшчэ даволі камфортна — каля 12—19 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

## Дзірка, што нясе гарачыню

### Незвычайнае цяпло — вынік разбурэння азонавага слою?

Як расказаў **вядучы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага навукова-даследчага цэнтра маніторынгу азонасферы Аляксандр КРАСОЎСКІ**, на працягу года над нашай краінай канцэнтрацыя азону пастаянна мяняецца, прычым ад максімальных да мінімальных паказчыкаў. І цяпер над Беларуссю з'явілася невялікая, але вельмі незвычайная азонавая дзірка. Яна злучана з дзіркай, што сёлета «вісіць» над Паўночным полюсам. Гэта даволі рэдкая з'ява.

— Мы шмат працуем над даследаваннем працэсаў, якія адбываюцца з азонавым слоем, і прыйшлі да высноў, што змяненне ўтрымання азону над пэўным рэгіёнам можа прыводзіць да сур'ёзных змен у клімаце. Чым цяплей летам ва ўмовах антыцыклону, тым менш азону ў стратасферы. Не выключана, што гарачае надвор'е ў нас і Еўропе — вынік так званага блакіравальнага эфекту, — адзначыў навуковец.

Пра гэта варта ўспомніць акурат сёння — у Міжнародны дзень аховы азонавага слою, калі спецыялісты з усяго свету заклікаюць зямлян звярнуць увагу на праблему яго змяншэння і звязаным з ёй працэсам глабальнага пацяплення.

Па словах **кансультанта аддзела рэгулявання ўздзеяння на атмасфернае паветра і азонавы слой Мінпрыроды Наталлі КЛІМЕНКІ**, наша краіна за апошнія трыццаць гадоў зрабіла шмат у кірунку захавання шчыта, які абараняе зямлян ад сонечнай радыяцыі. Калі ў 1980-я гады ў Беларусі выкарыстоўвалася каля 3000 тон азонаразбуральных рэчываў, то цяпер гэты паказчык складае ўсяго 30 тон, — адзначыла Наталля Кліменка. — Да 2020 года наша краіна павінна спыніць спажыванне (імпарт) азонаразбуральных рэчываў.

**Вераніка КОЛАСАВА.** *kolasava@zviazda.by*

■ Грамадства

## Праехаўся на тралейбусе — дапамог зберагчы прыроду

### У краіне стартуе Еўрапейскі тыдзень мабільнасці

**Маштабная кампанія пад эгідай Еўракамісіі ў партнёрстве з Міжнародным саюзам грамадскага транспарту праводзіцца ўжо 15-ы раз. Сёлета тэма акрэслена як «Разумная мабільнасць. Моцная эканоміка». Галоўная задача кампаніі — прыцягнуць увагу да развіцця эфектыўнай сістэмы транспартных камунікацый, для якой адзін з найважнейшых паказчыкаў, акрамя зручнасці і бяспечнасці, — экалагічнасць.**

1496 гарадоў Еўропы, у тым ліку і 12 беларускіх, на працягу 7 дзён будуць дэманстраваць перавагі альтэрнатыўных паездкам на аўтамабілях спосабаў перамяшчэння. Кульмінацыяй тыдня мабільнасці стане Дзень без аўтамабіля, які праводзіцца штогод 22 верасня. Неабыякавых гараджан экалагі заклікаюць хоць бы на адзін дзень аддаць перавагу грамадскаму транспарту, пешай прагулцы або веласіпеду.

У гэты дзень у сталіцы разгорнецца маштабнае свята. **Старшыня Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Сяргей МАСЛЯК** расказаў, што практычна на ўвесь дзень, з 6 гадзін раніцы да 12 ночы, будзе перакрыты рух па вуліцы Леніна. Тут будзе ўстаноўлена вялікая сцэна, культурна-забаўляльныя мерапрыемствы пачнуцца а 4-й гадзіне, урачыстае ж адкрыццё свята з удзелам гарадскіх уладаў запланавана на 6 гадзін вечара. У праграме — выступленні беларускіх артыстаў, воркаўт-заняткі, танцы, экстрэмальнае трыял-шоу, у якім юныя веласіпедысты змогуць прыняць удзел асабіста. Сталічная ратавальная служба падрыхтавала свой сюрпрыз і «перакуліла свет з ног на галаву»: на пляцоўцы будзе прадстаўлена машына-пэрэкрут. Самай відовішчнай часткай свята стане заезд святлівых веласіпедаў ад вуліцы Леніна да Нацыянальнай бібліятэкі, які пачнецца ў 9 гадзін вечара.

Аднак тых веласіпедыстаў, якія не змогуць паўдзельнічаць у парадзе, таксама чакаюць прыемныя бонусы. **Старшыня праўлення Мінскага веласіпеднага таварыства Павел ГАРБУНОЎ** падзяліўся інфармацыяй пра тое, што ў адзін з будных дзён актывісты будуць раздаваць садавіну тым, хто аддае перавагу двухколаваму транспарту. Акрамя таго, падчас акцыі можна будзе абмеркаваць з прадстаўнікамі аб'яднання тэму развіцця веласіпеднага руху.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## ЕЎРАКАМІСІЯ ПРАВЯДЗЕ СТРЭС-ТЭСТЫ НА АЭС

**Аб гэтым паведаміў начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар МЗС Дзмітрый МІРОНЧЫК.**

19—20 верасня Беларусь з рабочым візітам наведае дэлегацыя Еўрапейскай камісіі. Прадстаўнікі ЕК сустрэнуцца з кіраўніцтвам МЗС і правядуць перамовы ў Міністэрстве энергетыкі, Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях і Дзяржатамнаглядзе. Адзін з пунктаў праграмы — наведванне пляцоўкі, дзе будуецца Беларуская АЭС.

— Бакі абмяркуюць шырокае кола пытанняў па ўзаемадзеянні ў кантэксце рэалізацыі першай беларускай ядзернай энергетычнай праграмы, — адзначае Дзмітрый Міронічык, — але асноўнай тэмай візіту ўсё ж будзе стрэс-тэсціраванне, ацэнка рызык і бяспекі АЭС. Беларусь надае першараднную ўвагу пытанням ядзернай бяспекі. Наша краіна максімальна выкарыстоўвае інструментарый профільных міжнародных арганізацый.

Да канца гэтага года плануецца завяршыць тэсты. Іх вынікі будуць разгледжаны нацыянальным рэгулятарам — Дзяржатамнаглядам — і перададзены Еўрапейскай камісіі.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

## КАНЦЭНТРАЦЫЯ НА КІРАВАННІ

**Ва Узброеных Сілах Беларусі пачалося камандна-штабное вучэнне. На працягу тыдня органы кіравання Узброеных Сіл, іншых войскаў і вайсковых фарміраванняў будуць вучыцца кіраваць выбранымі сіламі і сродкамі пры выкананні задач па прызначэнні.**

У мерапрыемстве ўдзельнічаюць органы кіравання, вайсковыя часці і падраздзяленні Узброеных Сіл, аператыўныя групы і падраздзяленні міністэрстваў унутраных спраў і па надзвычайных сітуацыях, Дзяржаўнага пагранічнага камітэта, а таксама аператыўныя групы Камітэта дзяржаўнай бяспекі і Следчага камітэта Беларусі — усяго каля 7, 5 тысячы чалавек. Дзеля выканання задач вучэння з запасу прызвана каля 450 ваеннаабавязаных.

На першым этапе вучэння асноўныя намаганні сканцэнтраваны на кіраванні ў ходзе стварэння групоўкі Узброеных Сіл, іншых войскаў і вайсковых фарміраванняў у інтарэсах правядзення спецыяльнай аперацыі. На другім этапе на практыцы плануецца рэалізаваць кіраванне створанай групоўкай у ходзе вырашэння задач спецыяльнай аперацыі.

Упершыню падчас камандна-штабнога вучэння задзейнічаны практычна ўсе палігоны беларускай арміі. Акрамя таго, ажыццяўляць пастаўленыя задачы падраздзяленні будуць на тэрыторыі Полацкага і Горацкага раёнаў, у пунктах пастаяннай дыслакацыі.

**Вераніка КАНЮТА.**

## БУЙНЫМ ГАНДЛЁВЫМ СЕТКАМ АБЯЦАЮЦЬ «ПАДРЭЗАЦЬ КРЫЛЫ»

**На тэме нядобрасумленнай канкурэнцыі ў гандлі і пэўных канкрэтных кроках па яе выкараненні асобна спыніўся ўчора на прэс-канферэнцыі міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю Уладзімір Калтовіч.**

Міністр адзначыў, што цяпер іх ведамства павінна больш пільна кантраляваць долю тых ці іншых гульцоў рынку ў рознічным таваразвароце харчовых тавараў. Паводле праведзеных у 2015 годзе праверак у 45 тэрытарыяльных адзінках было выяўлена перавышэнне гэтай долі ў 20% у сямі суб'ектаў гаспадарання. Калі прагледзець дынаміку такіх парушэнняў, то, як сказаў Уладзімір Калтовіч, у 2014 годзе на перавышэнне долі «грашылі» толькі 4 суб'екты гаспадарання ў 28 тэрытарыяльных адзінках. Гэта істотныя парушэнні, але пакуль у новага міністэрства няма практыкі рэальнага супрацьдзеяння падобнай эканамічнай канцэнтрацыяй буйных гандлёвых сетак.

«Сёння адпаведныя структурныя падраздзяленні міністэрства актыўна працуюць над гэтай праблемай, бо настаў час навесці ў гэтай сферы парадак», — удакладніў сваю пазіцыю Уладзімір Калтовіч.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ЗАГІНУЎ БАЦЬКА ПЯЦЯРЫХ ДЗЯЦЕЙ

**У вёсцы Радастава Драгічынскага раёна ў агні загінуў бацька пяцярых дзяцей. Ратаўнікі атрымалі сігнал аб пажары каля 23 гадзін 14 верасня. Калі пажарны разлік прыбыў на месца, пажар бушаваў ва ўсю. Дах абрынуўся, пад яго абломкамі пажарныя знайшлі цела 38-гадовага гаспадара дома. На вялікае шчасце, яго жонка з дзецьмі ў гэтую ноч засталіся ў яго бацькоў у гэтай жа вёсцы.**

Як расказала карэспандэнту газеты **старшыня Радастаўскага сельскага Савета Алена СУХАРЭВІЧ**, ужо амаль дакладна высветлена, што прычынай пажару стала ўцечка газу, але праверку спецыялісты працягваюць.

— Маці вялікай сям'і знаходзіцца ў дэкрэтным водпуску. Сям'я пераехала ў Радастава з Кобрынскага раёна. Дом аднаўленню не падлягае, фактычна ён згарэў датла, — гаворыць Алена Сцяпанаўна. — Цяпер уся надзея на бацькоў шматдзетнай удавы. У яе маці ў Кобрынскім раёне ёсць добраўпарадкаваны дом, у бацькі загінулага мужа ў Радаставе таксама маецца прыстойнае жыллё. Калі жанчына з дзецьмі прыме рашэнне застацца ў нас, будзем уключаць яе ў чаргу на паляпшэнне жыллёвых умоў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## ХТО ТАКІ ЛАГІСТ?

**«Школа будучага лагіста-міжнародніка» ўпершыню адкрыецца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Гэта новыя прафарыентацыйныя курсы для старшакласнікаў, якія мараць пра кар'еру ў сферы міжнароднай лагістыкі. Галоўная мэта школы — аказанне кампетэнтнай дапамогі абітурыенту пры самавызначэнні і выбары будучай прафесіі.**

Яе слухачамі могуць стаць вучні 10–11-х класаў агульнаадукацыйных устаноў. У адукацыйную праграму ўключаны пытанні тэорыі і практыкі міжнароднай лагістыкі ў рамках універсітэцкага навучальнага курса «Асновы міжнароднай лагістыкі». У прыватнасці, школьнікі пазнаёмяцца з гісторыяй станаўлення міжнароднай лагістыкі, асновамі і прынцыпамі гандлю, сферай міжнародных перавозак грузаў, даведаюцца пра асноўныя дакументы, якія суправаджаюць патокі тавараў, разгледзяць мытныя аспекты ў сферы міжнароднай лагістыкі.

Заняткі будуць праходзіць два разы на месяц па суботах на факультэце міжнародных адносін. Заняткі распачнуцца 15 кастрычніка. Тым, хто паспяхова пройдзе курс, выдадуць сертыфікат. Навучанне ў «Школе будучага лагіста-міжнародніка» бясплатнае.

Запіс у школу ажыццяўляецца па тэлефонах: (+375 17) 209 57 51; 209 57 52.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

■ Рэпарцёр атрымаў заданне

# НАКАРМІЦЬ ТРОХ ЧАЛАВЕК ЗА 10 РУБЛЁЎ

**Даўнавата было, але помніцца. Адзін выпадковы знаёмы скардзіўся: у Брэсце надта цяжка з элітнымі прадуктамі. Калі і трапляюцца такія, то трэба быць асабліва ўважлівым з тэрмінамі захавання, а то іх не разбіраюць, і яны могуць залежвацца. «Таму мусіш па дарагія рыбу, мяса, сыры ў Польшчу ездзіць», — падзяліўся сваёй праблемай ну вельмі нябедны суайчыннік. Прайшло даволі часу, цяпер, відаць, і ў нашай краіне стала магчыма набываць асабліва дарагое і якаснае. Але ў большасці людзей сёння праблемы... як бы гэта сказаць мякка, крышачку іншыя, чым у нашага паспяховага героя. А пэўная частка грамадства мае клопаты прама процілеглыя і штодзень чухае патыліцу, як найбольш танна пракарміць сябе альбо сям'ю.**




Вось і карэспандэнт газеты задалася такім пытаннем, як выкруціцца, калі ў кашальку застаюцца апошнія 10 рублёў (сто тысяч на старыя), і прайшлася па брэсцкіх крамах і рынках розных формаў уласнасці.

Раней даводзілася чуць, што параўнальна нядаўна ў свабоднай эканамічнай зоне адкрылася крама «Белавежскія далікатэсы» аднайменнага прадпрыемства, куды многія людзі ездзяць з усяго горада. З'явілася нагода наведаць гэта гандлёвае прадпрыемства на вуліцы з цікавай назвай Кацін Бор. Сапраўды, там аказаліся ў наяўнасці каўбасы па цане 2 рублі 60 капеек і 2 рублі 88 капеек. Падобных цэн не даводзілася сустракаць больш нідзе. Прыкладна такі ж кошт значыўся на мясараслінных сасісках і сардэльках.

Антаніна Віктараўна, энергічная пенсіянерка, да якой я звярнулася на аўтобусным прыпынку, рэгулярна наведвае краму, а сёння збіраецца набыць упакоўку сардэлек. Паводле яе слоў, у вялікай сям'і даводзіцца эканоміць: зяць застаўся без работы, працуе адна дачка. Унукі, пакуль цёпла, шмат бегаюць па двары, запасы энергіі трэба папаўняць. Бабуля ўзяла на сябе і распараджэнне сямейнай касай і прыгатаванне ежы на дзень для ўсёй сям'і. Вось і ходзіць зранку па крамах.

Адна з самых танных каўбас названага магазіна — «Мінская» са шпікам — аказалася прымальнай на смак. У складніках прадуктаў пазначаны тлушч, манныя крупы, соевы бялок і іншыя інгрэдыенты, з-за якіх прадукт не купіць той, хто аддае перавагу здароваму харчаванню. Але ж бываюць сітуацыі, як у Антаніны Віктараўны. Таму запісваем на рахунак два з паловай рублі амаль за кілаграм каўбасы і адпраўляемся далей.

Вядома ж, бюджэтную вячэру складана ўявіць без бульбы. «Другога хлеба» на нашых рынках багата. І добрую бульбачку можна знайсці, напрыклад, на рынку мікрараёна Кавалёва па сорак капеек. Такім чынам, прыбаўляем 80 капеек за два кілаграмы. Затым выбіраем памідоры, агуркі, капусту. Дарэчы, капусту з агуркамі па 50 капеек даводзілася сустракаць у краме аблспажыўсаюза. Бо на рынку адборныя гурочкі ўжо даражэйшыя. А вось памідоры, якія прадаюць бабулькі нават на малых гандлёвых радах, сустракаюцца за рубель, а то і 80 капеек. За паўтара рубля мы запасаемся агароднінай і прыцэньваемся да яблыкаў. Ну які стол без дэсерту? А самы танны, здаровы і смачны дэсерт можна атрымаць, калі запячы антонаўку ці падобны на яе сорт з маленькай лыжачкай мёду ды карыцай.

На брэсцкіх рынках цана на яблыкі вагаецца ў межах ад 60 капеек да 2 рублёў. А нядаўна давялося праязджаць па вёсках Чарнаўчыцы, Вістычы побач з Брэстам, дзе вяскоўцы здаюць садавіну нарыхтоўшчыкам са спажыўкааперацыі. Дык вось, кааператары прымаюць яблыкі па 3 капейкі за кілаграм. Калі ў кагосьці зусім няма знаёмых у вёсцы альбо сваёй дачы, можна сесці ў прыгарадны цягнік, праехаць адзін прыпынак і прапанаваць тым жа бабулькам 5 капеек за кіло яблык. Яны і рады будуць, яшчэ і слівамі пачастуюць, а калі пашанцуе, дадуць у прыдачу кабачок. Бо цяпер год у нашай мясцовасці надзвычай ураджайны на слівы і яблыкі. І вельмі часта садавіна ападае і псуецца. Тыя жыхары вёскі, якія маюць гаспадарку, скормліваюць яблыкі скаціне.

Так што яблыкамі запасціся можна ў любой вёсцы амаль за бясцэнак. А вось свойскія яйкі ці малочныя прадукты купляць не выпадае, бо яны цэняцца цяпер даражэй за магазінныя. Так, дзясятак яек ад рабой бабінай курачкі менш чым за два рублі наўрад ці знойдзеш. А вось гродзенская птушкафабрыка мае сваю краму на папулярным брэсцкім рынку «Лагуна», там дзясятак яек можна набыць за 1 рубель 30 капеек. Для нашай умоўнай вячэры альбо абеду якраз падыходзіць.

Грошы ў нас, як нескладана ўпэўніцца, застаюцца. Можна падумаць пра яшчэ адну страву, напрыклад сырнікі. Тварог у вакуумнай упакоўцы добрай якасці пружанскага малочнага прадпрыемства ведаюць многія гаспадыні нашага абласнога цэнтра. Хаця б таму, што 400 грамаў яго каштуе прыкладна паўтара рубля. Калі купляць два пачкі ад іншага вытворцы, абыдзецца нашмат даражэй. Дарэчы, у гэтай жа краме па праспекце Машэрава часта бывае прадукцыя Лунінецкага малочнага завода, яна прадаецца крыху танней за вядомыя брэнды і вельмі смачная, тварог надта нагадвае дамашні. Так што малако і кефір мы возьмем менавіта тут. Ад першапачатковай зададзенай сумы застаецца мала, хіба толькі хлеба купіць.

Такім чынам, на нашы 10 рублёў мы можам наварыць бульбы, падаць яе з каўбасой, зрабіць салату з агародніны, прыгатаваць яечню і сырнікі. Апошняе пры ўмове, што ў доме знойдзецца шклянка мукі і некалькі лыжак алею. Пра дэсерт з яблыкаў я ўжо пісала.

***

Вядома, за 10 рублёў лепш купіць невялікі кавалак добрага мяса і запячы яго ў чаканні гасцей альбо выпіць па кубку кавы ў прыстойнай кавярні з дваімі сябрамі. Але прыведзеныя нататкі могуць зацікавіць тых, хто мае патрэбу і прывычку эканоміць. Ім варта прыглядацца да фірменных гандлёвых пунктаў прадпрыемстваў. Яны, як правіла, прадаюць тавар з мінімальнымі нацэнкамі. Пры падрыхтоўцы гэтага матэрыялу я заўважыла на цэнтральным рынку Брэста павільён тутэйшага мясакамбіната. Зверху вісела вялізная аб'ява аб зніжках. Чарга стаяла вялікая, значыць сапраўды прадавалі мясныя вырабы танней. Пра акцыі на асобныя прадукты гіпермаркетаў, думаю, ведаюць усе. Дарэчы, рыбу па зніжаных цэнах у самым заходнім горадзе краіны можна набыць у краме «Санты». Кожны месяц там ладзяцца акцыі.

Заўважана, што ёсць катэгорыя людзей, якія за хобі маюць звычку ездзіць па ўсім горадзе ў пошуках патрэбных ім прадуктаў. Выгаднае хобі. А я, напрыклад, найбольш люблю невялікія крамы ля дома, так званыя гандлёвыя пункты крокавай даступнасці. Добра было б, каб і ў іх цэны хоць калі-небудзь радавалі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

# БУЛЬБЯНАЯ ЭПАПЕЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Галіна Маркевіч жыве ў Мінску, а ў вёсцы Савічы, дзесьці за 140 кіламетраў ад сталіцы, ёй дастаўся ў спадчыну бацькоўскі дом. Восенню, як толькі сабраны ўраджай, яна гаворыць: усё, хопіць, больш нічога не буду садзіць ні ў агародзе, ні на сотках. А вясной зноў на выхадныя разам з мужам Сашам увіхаюцца на ўчастку.

— Тым, хто тут жыве пастаянна, значна лягчэй: не трэба кожную пятніцу пасля работы ляцець у вёску. Толькі бензін на адну паездку туды і назад цягне на 30 рублёў. Вось і лічы, колькі грошай трэба выкласці з кішэні за вясну, лета і восень. Але ж ты мяне ведаеш, такая ж самая дурніца, як была мая маці. Тая аж душылася за работай, — расказала Галіна Генадзеўна.

Раней мая сяброўка садзіла сотак 40 бульбы. Цяпер плантацыю скарацiла да 10 сотак. Вядома, у гарадской жыхаркі няма свайго каня. У калгасе, цэнтр якога знаходзіцца ў сямі кіламетрах ад нашай вёскі, перш за ўсё выдзяляюць жывёлу для пасадкі і капання бульбы сваім работнікам. У Савічах толькі адзін чалавек трымае каня. За ім становіцца чарга. Але гаспадару перш за ўсё трэба ўладкаваць сваё поле, а там — як атрымаецца. Даводзіцца звяртацца па дапамогу да мужчыны з суседняй вёскі Задзвея, які мае «сіўку». Раней у любога вяскоўца дзядзькі можна было наняць каня за бутэльку гарэлкі. Цяпер кажуць так: заплаці мне грошы, а «беленькую» я і сам куплю.

— Дзесяць новых рублёў ужо і замала, — сцвярджае мая суразмоўца. — За 30—40 рублёў у залежнасці ад памераў участка, магчыма, і дадуць згоду. Узяць каня можна і ў малаказдатчыкаў, якія збіраюць малако ў вяскоўцаў і возяць яго ў прыёмны пункт. Але толькі на непрацяглы час — жывёла ў пастаяннай рабоце. Ёсць яшчэ варыянт: наняць трактар, калі ўдасца дамовіцца з кіроўцам. Разлік за работу і тэхніку — як дамовішся, але не меней як 2 долары за сотку, — сцвярджае суседка.

Пасадзіць бульбу — палова справы. Калі вялікая кампанія, то нават і на 30 сотках можна ўправіцца за дзень. Значна цяжэй дагледзець пасевы. Трэба пабаранаваць, прапалоць, абагнаць, апрацаваць ад фітафторы (адна шклянка хіміі каля 3,5 рубля), даць рады каларадскаму жуку. Сёлета Галіна труціла гэтую навалач тры разы — таксама немалыя расходы. «А нехта, каб не труціць лішне, збірае насякомых рукамі ў бляшанку і спальвае», — кажа мая сяброўка і адначасова сочыць, каб я правільна сартавала ўраджай.

У баразне стаяць тры кошыкі: для буйной, сярэдняй і дробнай бульбы. Вялікія клубні прызначаны для асабістага стала. Крыху меншыя пойдуць на насенне. Драбнату можна аддаць таму, хто трымае курэй.

Яшчэ не наступіў поўдзень, а ўжо немагчыма было разагнуцца: ныла спіна, смылела ўсё цела.

— Перадыхніце крыху, а я тым часам на стол збяру, — прапанавала гаспадыня.

Ведаю, што яна вельмі добра гатуе. Але на гэты раз ежа здалася найсмачнейшай. Можа, таму, што на свежым паветры, затраціўшы шмат фізічных высілкаў, нагулялі звярыны апетыт. Пасля абеду так цяжка было зноў станавіцца ў баразну, але ж паабяцалі, што да вечара на полі не застанецца ніводнай бульбіны.

Пра «другі хлеб» Галіна Генадзеўна ведае ўсё ці амаль усё: для добрага росту клубні трэба саджаць на глыбіню 5-7 сантыметраў, паміж радамі пакідаць да 80 сантыметраў, паміж кустамі 30-35 сантыметраў. Калі бульба залягае неглыбока, то зямля лепш праграваецца і яны хутчэй і спарней узыходзяць.

Сёлета гаспадары толькі аднаго гною ўбухалі на 300 тыс. рублёў. Купілі ў чалавека, які трымае карову ды парсючоку. Таму і ўраджай парадаваў: бульба буйная, адна ў адну, чыстая.

— І што будзеш рабіць з ёй? Прадаваць? — пытаюся ў Галіны.

— От, якое прадаваць. Ты ж ведаеш мяне. Што сабе застанецца, што дзецям. Астатняе парадаю людзям. У вёсцы ёсць старэнькія бабулькі, якія ўжо не ў сілах пасадзіць бульбу. Няхай парадуюцца. Можна, праўда, лішкі здаць. Але трэба завезці на нарыхтоўчы пункт, наняць транспарт, а гэта лішнія выдаткі, або зрабіць заяўку, каб самі забралі ўраджай. Ды неабходна дамаўляцца на канкрэтны дзень, чакаць, калі прыедуць. Шмат клопатаў. Разам з тым здаваць бульбу ў сезон нявыгадна. Кошт вельмі нізкі: 2-4 тысячы (на старыя) за кілаграм. Але ж гэта не дробная, а адборная, таварная бульба. У крамах буханка хлеба каштуе ў два-тры разы больш. За кілаграм здадзенай бульбы я не куплю нават паўбуханкі. Вясной, калі цэны падымуцца, ёсць верагоднасць, што можна зарабіць крыху больш.

Ужо цямнела, калі мы падабралі апошнія клубні. А накапалі іх 40 мяхоў, адзін мех — прыкладна 40 кілаграмаў. Пасадачнага матэрыялу пайшло недзе каля 30 кг на сотку. На яго не давялося траціцца, бо гаспадыня заўсёды пакідае свой.

—Усё, кропка, адмучылася, на наступны год засею травой і поле, і агарод, — выдыхнула Генадзеўна. — Танней гародніну купіць у краме. Апошнія сокі выціснула гэтая бульба. Ціск скача. Больш на лекі патраціш, чым атрымаеш прыбытку.

— Мама, каб твае словы ды Богу ў вушы, — зарагаталі дзеці Андрэй і Наталля. — Колькі разоў абяцала нам «завязаць», а вясной зноў за сваё.

Вечарам гаспадыня паклікала на «дакопкі». Стол ламаўся ад пачастункаў. Выпілі па чарцы.

— Саша, ці купім мы нарэшце матаблок? — звярнулася Галіна да мужа. — Усё ж лягчэй ды танней будзе на наступны год пасадзіць і апрацаваць бульбу.

У адказ усе засмяяліся.

**Тацццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*



Равіль і Рустам НАСЫРАВЫ «набягаюць» падчас здымак звыш дзясятка кіламетраў, але сцвярджаюць, што стомы не адчуваюць.

# Раз рубель, два рубель

## Карэспандэнт «Звязды» прыняла ўдзел у начной тэлевізійнай раздачы грошай за веды

**Што можа быць цікавей, чым лічыць чужыя грошы? Хіба толькі самому іх атрымаць без дай ладу. Мабыць, менавіта гэтай уласцівасцю чалавечага характару абумоўлены «доўгайграючы» поспех шматлікіх тэлевізійных інтэлектуальных гульняў і віктарын. Таму і новы праект тэлеканала «Беларусь 2» — запушчаная літаральна ў канцы жніўня праграма «Два рублі» — абяцае быць рэйтынгавай. Стаць яе ўдзельнікам можа практычна кожны, каму пашанцуе сустрэць на вуліцы харызматычных вядучых «Двойкі» Равіля і Рустама Насыравых і, не разгубіўшыся ад раздравення ў вачах, адказаць на пытанні, што называецца, на агульную эрудыцыю. Адказаце правільна — атрымаеце падзяку і двухрублёвую манетку ў дадатак, дасце няправільны адказ — усё адно трапіце ў кадр і пачуеце на развітанне пажаданне добрага дня.**

### А што тут здымаюць?

Прынамсі, менавіта так праект выглядае ў эфіры. А як ён здымаецца насамрэч, ці ёсць сярод выпадковых прахожых «падстаўныя» акцёры і наколькі каштоўны для беларусаў прыз памерам у два рублі, карэспандэнт «Звязды» вырашыла даведацца на месцы. І напрасілася ў кампанію да здымачнай групы "Двух рублёў" падчас чарговага «палявання» на інтэлектуалаў.

...На гадзінніку дзесяць вечара. Ніякай памылкі няма: усяго праз некалькі хвілін здымачная група праекта адправіцца на эксперыментальны — начны — запіс чарговага выпуску «Двух рублёў». І час, і месца здымак у гістарычным цэнтры сталіцы выбраны не выпадкова: менавіта тут знаходзіцца модная сёлета сярод тусоўшчыкаў і турыстаў вуліца Зыбіцкая, якая ажывае з захадам сонца.

Усе крыху хвалююцца. Равіль і Рустам Насыравы старанна паўтараюць скараговркі, каб потым не перапісваць па некалькі дубляў праз недарэчныя памылкі вымаўлення тых ці іншых слоў. Асістэнт рэжысёра папраўляе грым на вядучых, а кіраўнік праекта нагадвае ім, каб абыходзілі цвярозых дарогай відавочна неадэкватных і нецвярозых людзей, а таксама прахожых з цыгарэтамі (тусоўка тусоўкай, а прапагандаваць шкодныя звычкі маладзёжнаму тэлеканалу не варта). Тры, два, адзін — і хлопцы, а следам за імі і мы са здымачнай групай, зрываемся на бег. У літаральным сэнсе.

Так-так, аказваецца, для таго каб угаварыць мінчан і гасцей сталіцы паўдзельнічаць у тэлегульні, іх спачатку трэба... дагнаць — як таму Шарыку з Прастаквашына героям сваіх фотаздымкаў. Дый тое некаторыя наадрэз адмаўляюцца. Вось і цяпер з першым кандыдатам выходзіць асечка: дзяўчына з вялікім ахапкам паветраных шарыкаў катэгарычна супраць усякіх пытанняў і адказаў — і на гэтым збягае з поля зроку.

— Дзяўчаты, вы не ведаеце, што тут здымаюць? — група маладых людзей з цікаўнасцю праводзіць позіркамі камеры і мікрафон.

— Ведаем! — хорам адказвае прыгожая частка здымачнай групы. — Хочаце паўдзельнічаць — адкажыце на пытанне! — Пасля гэтага хлопцы таксама знікаюць з бруквакі, нібыта нябачная карова іх языком злізала.

На якія пытанні, уласна, трэба адказваць тым, хто пагодзіцца абмяняць веды на грошы? Падборка разнастайная і не сказаць, каб занадта складаная. Напрыклад, як называецца планка, з якой вырабляюць рамы для карцін *(багет)*, або якое царкоўнае ўпрыгожанне стварыў майстар Лазар Богша *(крыж Еўфрасінні Полацкай)?* Тыя, хто глядзіць перадачу, седзячы дома на мяккай канапе, мабыць, зараз паблажліва ўсміхнуцца: як можна не ведаць такіх рэчаў? Насамрэч адказаць на пытанні знянацку, пад пільным вокам тэлекамеры, калі на роздум у цябе ёсць усяго некалькі секундаў, здолее далёка не кожны. Таму, калі некалькі чалавек запар не адказваюць на пэўнае пытанне, вядучыя агучваюць адказ самі і пераходзяць да іншага, перамяжоўваючы простыя і складаныя заданні.

### Пламбір ці шарданэ?

Вулічныя музыканты і прыхільнікі іх творчасці, ахоўнікі мясцовых кавярняў і наведнікі летніх тэрас, вясёлыя кампаніі і засяроджаныя адно на адным парачкі, турысты і простыя прахожыя — даведацца, у каго з іх больш шырокі кругагляд, добрая памяць і хуткая рэакцыя, можна толькі доследным шляхам. Блізняты-вядучыя «экзаменуюць» то адных, то другіх і, здаецца, радуюцца правільным адказам ледзьве не больш за самых гульцоў.

— Як называецца гатунак марожанага і горад у Францыі, дзе яго ўпершыню прыгатавалі? — спыняюць Равіль і Рустам шумную кампанію юнакоў і дзяўчат. Тыя з радасцю штурхаюць наперад аднаго з хлопцаў: «Ён усё ведае пра Францыю!», — але той толькі разгублена паціскае плячыма.



Апошняя падрыхтоўка перад стартам.

— Шарданэ? — няўпэўнена мяркуе адна з дзяўчат.

— Варыянт цікавы, але няправільны, — усміхаюцца вядучыя. — Усё адно, добрага вечара!

Літаральна на рагу вуліцы сустракаем жвавага веласіпедыста, якога ніяк не западозрыш у любові да марожанага. Аднак менавіта гэты мужчына называе варыянт «пламбір» *(насамрэч назва горада больш складаная, Пламб'ер-Ле-Бем, але хто будзе прыдзірацца? —* **Аўт.**) і з падзякай прымае свой прыз — двухрублёвую манету.

— О, глядзіце, «Два рублі» пабеглі! — даносіцца скрозь адчыненыя дзверы адной з кавярняў.

— Вось і слава прыйшла, хлопцы, — каментую я.

— Не, гэта, напэўна, хтосьці са знаёмых. Звычайна нас блытаюць — і аднаго з адным, і з іншымі тэлевядучымі. Праўда, Арцём Рыбакін? — жартуе з брата Рустам.

...Час наблжаецца да паловы дванаццатай, а пошук інтэлектуалаў сярод мясцовых тусоўшчыкаў працягваецца — трэба сказаць, з пераменным поспехам. Нехта з упэўненасцю называе вучонага, чым імем названы хаатычны рух мікраскапічных часціц *(а вы ведаеце імя Роберта Броўна? —* **Аўт.**), затое потым некалькі чалавек запар так і не могуць адказаць, сімвалам якога будынка ў Маскве з'яўляецца чацвёрка коней *(задачка на пільнасць тым, хто фатаграфаваўся на фоне Вялікага тэатра —* **Аўт.**). Некаторыя прахожыя ўсё так жа шарахаюцца ад камеры, быццам мы падатковыя інспектары, якія прыйшлі па гадавую запазычанасць, іншыя, наадварот, запавольваюць крок і нават просяць сфатаграфавацца на памяць з блізнятамі.

— На якім музычным інструменце іграюць у галёшах? — мо ў чацвёрты раз гучыць даволі складанае пытанне. Чарговы гулец спрабуе ўгадаць, актыўна дапамагаючы сабе рукамі: «Цымбалы? Не? Тады не ведаю». Вядучыя называюць правільны адказ: «Арган». — «І што мне цяпер рабіць з гэтай інфармацыяй?!» — збянтэжана перапытвае малады чалавек.

Двухрублёвікі ў чырвоным мяшэчку-гаманцы яшчэ бразгочуць, аднак здаецца, матэрыялу ўжо запісана больш чым дастаткова. Фінальнае сэлфі з начных здымак — і вуліца ў цэнтры сталіцы працягвае шумець ужо без нас. А што далей? Глядзіце кожную нядзелю ў вячэрнім эфіры!



Эмоцыі ва ўдзельнікаў праграмы самыя розныя.

### Простая мова

***— Ці часта пытаюцца, чаму ўзнагарода такая маленькая — усяго два рублі?*** — распытваю пасля здымак вядучых праекта.

— Бывае і так. Але, сказаць па праўдзе, часцей не бяруць грошы, маўляў, я чалавек самадастатковы, няблага жыву і сам магу вам даць два рублі, — дзеліцца назіраннямі Рустам Насыраў. — Дык у чым пытанне — стань Робін Гудам, зарабі і раздай гэтыя грошы!

— Безумоўна, два рублі — выйгрыш невялікі, — дадае Равіль, — але ён і не мусіць быць памерам з галоўны прыз у латарэі, мы гэта называем «дробязь, а прыемна».

***— Спрабавалі падлічыць, колькі «набягаеце» падчас здымак кожнай праграмы?***

— Неяк уключалі крокамер, атрымалася ці то 15, ці то нават 17 кіламетраў. Аднак гэта наогул неадчувальна, запіс праходзіць на адным дыханні.

***— Калі шчыра, самі вы маглі б адказаць на ўсе пытанні гульні?***

— Не! *(хорам).* Наогул дзіўна, што нехта ў такіх умовах — камеры, мікрафон, два чалавекі прыспешваюць, маўляў, думай хутчэй — правільна адказвае. Гэта мусіць быць нейкі ўнутраны стрыжань...

***— Якія першыя водгукі атрымліваеце ў сацыяльных сетках — праект падабаецца або не вельмі?***

— Збольшага падабаецца, але шмат пішуць і пра тое, што народ у нас вельмі пужлівы, зацiснуты, нібыта ўсе панабіралі крэдытаў і не сплачваюць. Спадзяюся, мы іх разварушым — так, брат?

— Так, хто б мог падумаць, што ў наш час людзі будуць збягаць ад грошай? Думаю, далей будзе лягчэй, бо гледачы даведаюцца, што ёсць такая перадача, і перастануць нас палохаца.

### Як гэта зладжана

***— Як выбіраецца месца для здымак ці гэта імправізацыя?*** — удакладняем у шэф-рэдактара праекта, намесніка галоўнага дырэктара тэлеканала «Беларусь 2» Юліі Кобрыкавай.

— Кожны раз — імправізацыя. Мы проста выязджаем у цэнтр Мінска, а далей — як пойдзе. Аднойчы забегілі на вуліцу Карла Маркса, а яна пустая, зусім, ніводнага чалавека! Тады вярнуліся на цэнтральны праспект — як у іншы свет: навокал людзі, жыццё віруе.

***— Пакуль што «Два рублі» вандруюць па Мінску. Ці ёсць жаданне выехаць за кальцавую, у іншыя гарады?***

— Так, безумоўна, і ў нас у планах ужо стаяць такія камандзіроўкі — у наступным квартале будзем выязджаць і за МКАД, і за межы вобласці. Тым больш нас ужо многія пазнаюць, прычым не толькі моладзь, але часам і пенсіянеры.

***— У «Двух рублёў» існуе грашовы ліміт?***

— У бюджэце на кожны выпуск нас не абмяжоўваюць, калі вы пра гэта *(смяецца).* Можам раздаць хоць тры манеты, хоць дзясятак — звычайна глядзім не на патрачаную суму, а на хранаметраж праграмы. Калі мала адказваюць, то задаём прасцейшыя пытанні, а калі наздымалі ўжо досыць, то гульню спыняем.

***— Хто адбірае пытанні для праекта? Якая частка з іх датычыцца Беларусі?***

— Ніякай «квоты» на пытанні пра нашу краіну няма, але яны, безумоўна, гучаць у кожным выпуску. Самі пытанні — на розныя тэмы, на агульнае развіццё — падбірае спецыяльны рэдактар, а мы ўжо ў працэсе здымак абмяркоўваем, у якой чарговасці іх лепш задаваць. І, ведаеце, тут ніколі не ўгадаеш. Нам пытанне здаецца простым, а на яго ніхто не можа правільна адказаць — напрыклад, «Чым заканчваецца дзень і ноч?» *(у рускай мове — мяккім знакам. —* **Аўт.**) І наадварот, ёсць пытанні, якія мы называем «небяручкі»: упэўнены, што іх ніхто не возьме, а з імі першы сустрэчны спраўляецца.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**


## «ХАЙ ЗІМА БУДЗЕ ЦЁПЛАЙ!»

**КАЛІ ВЫ ПАДПІСАЛІСЯ НА ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА»**





**на IV квартал або II паўгоддзе 2016 года, запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце**

**ДА 11 КАСТРЫЧНІКА 2016 ГОДА**

**ў рэдакцыю на адрас:**

**220013, г. Мінск, вул. Б.Хмяльніцкага, 10а.**





Сярод падпісчыкаў 14.10.2016 года будуць разыграны 7 сякер-калуноў Startul і суперпрыз — бензапіла ланцуговая Husqvarna. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 24.10.2016 г.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі па 31.12.2016 г. пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або II паўгоддзе 2016 г. і пашпарта. Пасля 31 снежня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Хай зіма будзе цёплай!» чытайце ў нумары 172 газеты «Звязда» ад 07.09.2016 г.

**Тэлефон для даведак (017) 284 44 04.**

**ТЭРМІН ПРАВЯДЗЕННЯ ГУЛЬНІ — З 08.09.2016 ПА 31.12.2016.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 2818 ад 01.09.2016 г., выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь.

**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал 2016 года**

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ____________________

____________________

**Падпіска афармлена і аплачана ў** ____________________

(аддзяленне сувязі)

**на IV квартал 2016 года**

**Хатні адрас і тэлефон** (абавязкова) ________ (індэкс)

____________________

____________________

**Удачы ў розыгрышы!**


■ Падпіска-2016

## У СУБОТУ — У ЛЯХАВІЧАХ!

Павеяла восеньскай прахалодай, аднак гэта зусім не паўплывала на актыўнасць сустрэч звяздоўцаў са сваімі чытачамі. Мы пабылі ў Беразіне, Карэлічах, Мастах, Пухавічах. І паўсюль сустракалі гасцінных, неабыякавых людзей.

Заўтра звяздоўцы накіруюцца ў Брэсцкую вобласць — у Ляхавіцкі раён. Мясціны адметныя, людзі выдатныя, таму мы вырашана завітаць менавіта сюды. Дзень падпісчыка газеты «Звязда» адбудзецца 17 верасня з 11 да 14 гадзін на Ляхавіцкім раённым вузле паштовай сувязі. Прыходзьце суботнім дзянькам з карысцю бавіць вольны час. Будзе цікава! ■

## Аўторак, 20 верасня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.25** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.50** Зона Х.
**9.10 Серыял «Сваякі».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.10, 20.00 Серыял «Жаночы доктар».**
**12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.20** Дзень у вялікім горадзе.
**14.20** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Цікаўная Варвара-3».**
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.10** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Спецыяльны рэпартаж.
**22.00 Серыял «След».**
**0.45** Дзень спорту.
**0.55 Серыял «Дальнабойшчыкі. Праз дзесяць гадоў».**

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 22.20** Тэлебарометр.
**9.05, 20.00 Дэтэктыў «Такая работа».**
**9.55, 21.10** «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**10.55** Два рублі.
**11.00** «Анлайн». Скетчкам.
**11.50, 17.15 Серыял «Мая выдатная нянька».**
**12.25, 17.55 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**13.25, 18.55 Серыял «Кухня».**
**14.30** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**15.30** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.10, 22.25 Трылер «Анёл ці дэман».**
**22.10** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**23.30 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».**

### Беларусь 3

**7.00** «Дабранак».
**7.35, 12.45, 18.45, 21.00** Навіны культуры. «Калейдаскоп».
**7.55, 17.40 «Вечны кліч». Драма. Фільм першы.**
**9.00, 20.00** «Выдатныя авіяканструктары». Аляксандр Якаўлеў.
**9.40 «Продлись, продлись, очарованье...» Меладрама.**
**11.05** «Святло далёкай зоркі». Памяці паэта, літаратуразнаўца, крытыка Алега Лойкі.
**11.30 «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана». Серыял. «Скарбы Агры», 1-я серыя.**
**13.00, 19.00** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**13.05** «Час кіно».
**13.10 «Глыбокая плынь». Драма.**
**14.45** «Гуляй, душа!» Канцэрт Беларускага дзяржаўнага ансамбля народнай музыкі «Свята».
**15.55 «Кактэбель». Драма.**
**19.05** «У гасцях у Барыса Аверына».
**20.40** «Калыханка».
**21.15 «Султан Бейбарс». Драма.**

### Беларусь 5

**8.00** Пра спорт. Вынікі тыдня.
**8.40** Час футбола.
**9.20** Параалімпійскія гульні. Рыа-2016. Урачыстая цырымонія закрыцця.
**11.25** Тэніс. Кубак Дэвіса. Беларусь — Данія.
**15.35** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — «Авангард» (Омск).
**17.30** Авертайм.
**18.00, 23.10** Пра спорт. Навіны.
**18.10** Хакей. Кубак Беларусі. 1/2 фіналу. Першы матч. «Шахцёр» (Салігорск) — «Юнацтва» (Мінск).
**20.25** Хакей. Кубак Беларусі. 1/2 фіналу. Першы матч. «Нёман» (Гродна) — ХК «Гомель».
**22.40** Спорт-кадр.

**23.20** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Першы тур. Агляд.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10, 0.25** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10, 23.25** «Пра каханне».
**15.10, 16.20** «Час пакажа».
**17.00** «Давай пажэнімся!»
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Медсястра».**
**22.55** «Адваротны адлік». «Легенды і былі беларускага біятлона».
**01.15** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.40** «Тайны Чапман».
**9.30, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.40** «Сямейныя драмы».
**11.35** «Не хлусі мне!»
**12.35, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** «Наша справа».
**14.05 Маст. фільм «Мытня».**
**15.30** «Вадзіць па-руску».
**16.00 «Следакі». Серыял.**
**16.50** «Цэнтральны рэгіён».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Тэрыторыя памылак».
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.00** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**23.20** «Аўтапанарама».

**0.30** «Разумней не прыдумаеш».
**1.25 «Халасцякі». Серыял.**

### МІР

**12.30** «Цяжар абеду».
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15, 19.20 Серыял «Маша ў законе».**
**16.20 Серыял «Невідзімкі».**
**17.15, 3.10 Серыял «Таварышы паліцэйскія».**



**20.10 Серыял «Маша ў законе-2».**
**22.00 Маст. фільм «Даравание».**
**23.45** Ток-шоу «Слова за слова».
**0.40 Серыял «Пётр Вялікі».**
**2.15** «Экстрасэнсы. На той бок іншага свету».
**2.45** Дак. серыял «Зямля. Тэрыторыя загадак».
**4.45 Маст. фільм «Дзяўчына спяшаецца на спатканне».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Пакой смеху».
**12.00** «60 хвілін». Ток-шоу .
**13.15** «Правілы жыцця».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.30 Серыял «Заўсёды гавары «заўсёды».**
**19.10, 20.40 Серыял «Каменская».**
**21.45, 23.10 Серыял «Карына Чырвоная».**
**23.35** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00** «Новая раніца».
**8.30** «Студыя Юліі Высоцкай».
**9.00 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.25 Серыял «Дэльта. Працяг».**
**12.00** Суд прысяжных.
**13.20, 23.00** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**13.55** «Тайны следства».
**14.25 Серыял «Бывай, «Макараў»!»**
**15.20** «Агенцтва схаваных камер».
**16.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.00** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Унутранае расследаванне».**
**23.30** «Вынікі дня».
**0.00 Серыял «Марскія д'яблы».**

### 8 канал

**7.00, 14.25, 19.20, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.20, 14.30 Камедыя «Вяселле па абмене».**
**8.50, 18.10 Серыял «Сапраўдны дэтэктыў».**
**9.40 Серыял «Маскоўская сага».**
**10.30** «Мой любімы гадаванец».
**11.00 Камедыя «Дэжа Вю».**
**12.45 Драма «Дрэйф».**
**14.15, 16.45, 18.00, 19.10** «Хатняя крама».
**16.30** «Дзецям пра звяранят».
**17.00 Серыял «Малышка Дорыт».**
**19.25 Серыял «Чорны спіс».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Надвор'е».
**21.10** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.20 Драма «Уцёкі з турмы».**
**23.00 Серыял «Закон і парадак».**

### ВТБ

**6.00, 16.10** «Турбаміксер».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.20** М/ф «Фіксікі».
**7.50** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.10, 14.00** «Ералаш».
**8.30, 18.00** Серыял «Вароніны».
**9.30, 19.10** Серыял «Дах свету».
**10.40, 15.00, 20.20** Серыял «Два бацькі, два сыны».
**11.20** «Уральскія пельмені».
**12.00** Камедыя «Вясельная вечарынка».
**14.20** Серыял «Апошні з Магікян 3».
**17.00, 4.00** «Лаві момант».
**17.30, 3.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**21.30** Меладрама «Праклён маёй маці».
**23.30, 5.00** Серыял «Косці».
**0.30** Серыял «Бязмоўны сведка».
**2.30, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**3.00** «Дурні і дарогі».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.40** Навіны культуры.
**10.15** «Назіральнік».
**11.15, 0.00** «Каломба». Серыял.
**12.30** «Ганчарны круг». Дак. фільм.
**12.45, 20.45** «Правілы жыцця».
**13.10** «Эрмітаж».
**13.40** «Дзень за днём». Серыял. 1-я серыя.
**15.10** «Саці. Нясумная класіка...»
**15.50** «Адысея вады на планеце Зямля». Дак. фільм.
**16.45** «Кінескоп». 73-ці Венецыянскі МКФ.
**17.25** Да 110-годдзя з дня нараджэння Дзмітрыя Шастаковіча. Канцэрт №1 для фартэпіяна з аркестрам і камерная сімфонія до мінор.
**18.30, 23.20, 1.40, 2.40** Сусветныя скарбы.

**18.45, 1.15** «Крым. Загадкі цывілізацыі». Дак. серыял.
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** Штучны адбор.
**21.10, 1.55** «Дынастыя без грыму».
**22.00** Ступені цывілізацыі. «Вялікая тайна матэматыкі». Дак. фільм.
**22.55** «Хто мы?» «Прыгоды лібералізму ў Расіі».
**23.55** Мастсавет.

### Настальгія

**6.00** «Зямля—Паветра». Валерый Кіпелаў. 2003 год.
**7.20, 11.25, 13.00, 14.40, 15.40, 17.00, 19.00, 20.40, 21.40, 23.00, 2.40, 5.30** Музычная настальгія.
**8.00** Дак. фільм «Францыя, песня...»
**9.00** «Удовін параход». Фільм-спектакль. 1989 год.
**12.00** «СевАлогія» з Севам Наўгарадцавым: «Радыё 70—80 гг». 2005 год.
**13.20** Маст. фільм «Вяртанне з арбіты».
**15.00, 21.00** «Мінулы час».
**16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**17.15** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...» Уладзімір Этуш.
**18.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Антысаветчыкі». 2005 год.
**19.20** Маст. фільм «Дні лётныя».
**0.10** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1990. 2-я частка. 2010 год.
**2.00** «Тэма» з У. Ліссьевым: «Нашы комплексы». 1992 год.
**3.00** «Быў час». 2009 год.
**4.00** Фільм-спектакль «Алі-Баба і 40 разбойнікаў». 1983 год.
**5.20** «Час пік» з Андрэем Разбашам. 1997 год.

### EuroSport 1

**4.00, 20.25** Снукер. «Мастэрс».
**6.00, 9.30** Футбол. Чэмпіянат MLS. Найлепшыя моманты.
**6.30, 11.00, 17.30** Тэніс. Турнір ATP.
**8.00, 15.45** Веласпорт. Энека Тур.
**10.00** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**22.30** «ERC знутры».
**23.00** Аўтаспорт. Этап чэмпіянату свету па гонках на вынослівасць.
**23.30** «Піт-стоп».
**0.00** Аўтаспорт. Серыя Blancpain Endurance.
**1.05** Watts.
**1.15** Міні-футбол. Чэмпіянат свету.

### Кінакамедыя

**0.50** Камедыя «Піжон».
**2.30, 10.40** Камедыя «Пільная двойка».
**4.05** Камедыя «Бамбу».
**5.45** Меладрама «Нявеста з таго свету».



**7.25** Камедыя «Хачу як Брыджэт».
**9.05** Камедыя «Касякі».
**12.20** Меладрама «Законы прывабнасці».
**14.00, 14.55, 15.35** Скетчкам «Паміж намі».
**14.15, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Камедыя «Цудоўная чацвёрка».
**17.40** Камедыя «Вясёлыя і загарэлыя».
**19.30** Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе 2».
**21.10** Камедыя «Мамулі».
**22.50** Камедыя «Сутэнёр».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.50** «Доктар I...»

**8.20, 18.55, 2.00** «Асколкі». Серыял.
**9.55, 4.30** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**11.35** «Сляпая».
**12.35** «Варажбітка».
**13.40** «Тайныя знакі».
**14.35** «Шафа».
**15.25** «Здзелка».
**15.55** «Ежа, я люблю цябе».
**16.50, 21.55** «Рэвізора».
**17.55** «Тайны следства». Серыял.
**20.55, 1.10** «Жанна, пажані».
**23.00** «Зоркі і містыка».
**23.40** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.25** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**3.45** «Нераскрытыя тайны».

### ТБ1000

**6.10, 16.25** Меладрама «Версальскі раман».
**8.10** Драма «Непакораны».
**10.25** Драма «Гульня з агнём».
**12.15** Прыгоды «Неверагодная падарожжа містэра Співета».
**14.05** Трылер «Востраў».
**18.25** Баявік «Солт».
**20.10** Фантастыка «Спадар Ніхто».
**22.35** Меладрама «Даверся сябрам».
**0.10** Баявік «Шпіёнскія гульні».
**2.25** Драма «Дваццаць адно».
**4.40** Меладрама «Адна сустрэча».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Драма «Я не вярнуся».
**8.20** Камедыя «Прывід».
**10.20** Драма «Прывітанне ад Кацюшы».
**12.20** Трагікамедыя «Яна».
**14.30** Меладрама «Прагулка».
**16.15** Камедыя «Ключ ад спальні».
**18.40** Камедыя «Няўлоўныя».
**20.20** Меладрама «Сатысфакцыя».
**22.10** Камедыя «Раскоп».
**23.40** Драма «Прывітанне ад Кацюшы».
**1.25** Драма «Дэманы».

**2.40** Трылер «Дамавік».



**4.40** Камедыя «Дзень дурня».

### National Geographic

**6.00, 9.35, 17.10, 18.40, 22.30** Космас. Прастора і час.
**6.50, 13.20, 20.15** Гульні розуму.
**7.10, 13.45, 5.25** Навуковыя недарэчнасці.
**8.05, 14.10, 21.00, 0.50, 2.20, 3.50** Сапраўдны геній.
**8.50, 14.55, 21.45, 1.35, 4.40** Неверагодныя машыны.
**10.20, 17.55** Навука будучыні.
**11.05** Сапраўдны суперкар.
**11.50, 15.40, 19.30, 23.15, 3.05** Расследаванні авіякатастроф.
**12.40** Чалавек супраць YouTube.
**16.25, 0.00** Паранармальнае.

### Discovery

**8.00** Хуткія і гучныя.
**9.00, 15.00, 21.30** Як гэта ўстроена?
**9.30, 21.00** Як гэта зроблена?
**10.00, 13.00, 18.30** Склады.
**10.30, 19.00, 3.20** Багажныя войны.
**11.00, 5.30** Гульня на жыццё.
**12.00, 4.40** Чыгунка Аляскі.
**13.30, 19.30, 2.55** Бітва за нерухомасць.
**14.00, 7.10** Эфект Карбанара.
**15.30, 20.00, 2.00** Махінатары на трасе.
**16.30** У пагоні за класікай.
**17.30, 3.50** Залатая ліхаманка.
**22.00** Махінатары.
**23.00** Мяцежны гараж.
**0.00** Вулічныя гонкі.
**1.00, 6.20** Салдаты няўдачы.
**1.30, 6.45** Беар Грылс: кадры выратавання.

---

## Сядзі і глядзі

# Пра мінулае, сучаснае і вечнае

**Што: камедыя «Дзяўчына спяшаецца на спатканне»**
**Калі і дзе: МІР, 22 верасня ў 1.45**



Прэм'ера гэтага фільма, знятага «Белдзяржкіно», адбылася 80 гадоў таму, але ўжо ў 1937-м камедыя знікла з экранаў. Не той быў час, каб беспакарана весяліцца, што адбілася і на трагічных лёсах рэжысёра, аператара ды іншых удзельнікаў здымачнай групы.

Сюжэт для 30-х гадоў мінулага стагоддзя, трэба сказаць, нетрывіяльны. Два масквічы — прафесар Фёдараў і служачы-абутнік Гураў — прыязджаюць на курорт Есентукі, але высвятляюць, што абодва забыліся дома пашпарты, і просяць жонак тэрмінова выслаць дакументы. Аднак дзяўчына-экспедытар, якая афармляе бандэролі, адначасова дамаўляецца па тэлефоне пра спатканне, таму нядзіўна, што блытае канверты. А паколькі на той час фота ў пашпарце ў СССР не з'яўлялася абавязковым элементам, узнікае цэлы шэраг забаўных непаразуменняў, пакуль жонкі галоўных герояў не прыязджаюць на курорт і не расстаўляюць усе кропкі над «і».

**Што: дэтэктыў «Два білеты на дзённы сеанс»**
**Калі і дзе: СТБ, 24 верасня ў 7.45 і 1.50**



Гэты чорна-белы дэтэктыў з хітра закручаным сюжэтам (складзеным паводле рэальнай крымінальнай справы кіраўніка буйной гандлёвай базы) таксама з катэгорыі фільмаў-юбіляраў, бо здымаўся 50 гадоў таму. Адпаведна, на экране — россып зорных імёнаў, ад зусім маладых тады Аляксандра Збруева і Людмілы Чурсіной да Бруна Фрэйндліха і Станіслава Чэкана.

...Камсамолец Алёшын працуе ў аддзеле барацьбы з раскраданнем сацыялістычнай уласнасці, аднак зусім не адчувае ў сабе прызвання да міліцэйскай справы, таму піша рапарт аб звальненні. Начальнік згодны яго адпусціць пасля выканання апошняга задання: высветліць, як звязаны паміж сабой білеты ў кіно на адзін і той жа сеанс, але на розныя дні, знойдзеныя ў затрыманых нядаўна злачынцаў — валютных махляроў. Выконваючы даручэнне, Алёшын нечакана высвятляе, што білет на дзённы сеанс — «пароль» для цэлай злачыннай сеткі, якая выкарыстоўвае ў сваіх інтарэсах вынаходку маладога савецкага вучонага...

**Што: драма «Кактэбель»**
**Калі і дзе: «Беларусь 3», 20 верасня ў 15.55 і 21 верасня ў 9.55**



Праект гэтага фільма-метафары выношваўся доўгія 8 гадоў, але вынік быў таго варты: карціна ўзяла некалькі прэстыжных кінаўзнагарод і адкрыла для шырокай публікі імя рэжысёра Барыса Хлебнікава.

...Па дарозе з Масквы ў Кактэбель рушаць двое: бацька і сын. Аднойчы першы расказаў другому пра гару, з якой можна паляцець на планёры — і цяпер настаў час спраўдзіць дзіцячую мару. Але на шляху здарэцца ўсякае: сустракаюцца людзі добрыя і злыя, сутыкаюцца практычнасць і рамантызм, б'юцца за ўладу над чалавекам сляпая пакорнасць лёсу і памкненне да мэты. Хто і што пераможа? Адказ недзе пад канец, бо часам трэба прайсці тысячу кіламетраў, каб адшукаць таго, хто побач

# ШАШКІ

**Выпуск №20**

Сёння ў нашым аддзеле для самастойнага рашэння прапануюцца праблемы, якія прыслаў наш чытач Уладзімір Бандарык (в. Слабада, Мінскі р-н).

**№27**

**Белыя:** простыя шашкі d4, f6, g5, g7, h6 (5).

**Чорныя:** простыя шашкі a3, b2, c3, c7, d2, g3, h4 (7).



**№28 Белыя:** простыя шашкі a1, b2, b4, c7, e1, f2, h4, h6 (8).

**Чорныя простыя:** a5, b8, c3, d2, d4, e5, e7, f6, h2, h8 (10).

У абедзвюх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць.

Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

З 24 жніўня па 3 верасня ў Кранева (Балгарыя) праходзіў **маладзёжны чэмпіянат свету па шашках-64**. Зноў парадавалі прадстаўнікі Беларусі. На пачатку спаборніцтваў 25 жніўня прайшоў чэмпіянату свету па маланкавай гульні. Пераможцамі сталі **Вера Хвашчынская і Міхаіл Семянюк**, другое месца ў **Вікторыі Нікалаевай і Уладзіслава Валюка**, трэцяе ў **Аляксандры Спірыднай і Марата Льва**. Затым шашысты разыгралі медалі чэмпіянату свету па хуткай гульні. Чэмпіёнамі сталі **Вера Хвашчынская, Уладзіслаў Валюк і Марат Леў**. «Серабро» выйгралі **Аляксандра Спірына і Дар'я Нікіфарава**, «бронзу» — **Міхаіл Семянюк і Аляксандра Сіняк**.

**Праверце свае рашэнні:** выпуск №19 ад 02.09.16.

**№25** c7, b6, b4, c7, c3x

**№26.** b4(d4), ed2, b6 (b4), c7, c3x

Дакладныя адказы даслалі А. Шурпін (Івянец), А. Ліцвінаў (Мінск).

**Пішыце на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, газета «Звязда», e-mail: info@zviazda.by, або vorush@yandex.ru**

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**

## Тэлесеткі

# ХЛУСАМ — БОЙ!

### «Беларусь 2» пачынае барацьбу супраць махлярства

**У наступную нядзелю на тэлеканале «Беларусь 2» стартуе новы праект, аўтары якога збіраюцца выводзіць на чыстую ваду махляроў, падманшчыкаў і хлусаў. Праграма «Нас не падманеш» абяцае максімальна падрабязна расказаць пра тэхналогіі падману і спосабы барацьбы з ім.**

Напрыклад, у самым першым выпуску стваральнікі праграмы расакажуць пра тое, якіх правілаў бяспекі неабходна трымацца ў інтэрнэце, каб не стаць ахвярай махляроў; ці варта верыць «лістам шчасця» ад замежных прынцаў; чым стасункі ў «Скайпе» пагражаюць дзелавой рэпутацыі; што такое экстэндар і наколькі ён можа паўплываць на асабістае шчасце канкрэтнага чалавека, а таксама пра тое, якія рэальныя пагрозы прадугледжаны за віртуальныя зламысніцтвы.

У наступных серыях аўтары праекта плануюць пазнаёміць гледачоў бліжэй з тэхналогіяй і псіхалогіяй падману. Карэспандэнты «Беларусь 2» з дапамогай спецыялістаў даведаюцца як, нават папаўшыся на вуду падманшчыкаў, абараніць сябе і дабіцца справядлівасці.

**Вікторыя ЗАХАРАВА**

# Пятніца, 23 верасня

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.45** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.20** Зона Х.
**9.10 Серыял «Сваякі».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.10, 20.00 Серыял «Жаночы доктар».**
**12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.20** Дзень у вялікім горадзе.
**14.20** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Дом з ліліямі».**
**17.30** Terra incognita. Беларусь невядомая.
**18.05** Тайны следства.
**21.00** Панарама.
**21.45** Нашы.
**22.00 Меладрама «Рыта».**
**0.05** Дзень спорту.
**0.15 Серыял «Дальнабойшчыкі. Праз дзесяць гадоў».**

## Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 20.55** Тэлебарометр.
**9.05, 20.00 Дэтэктыў «Такая работа».**
**9.55** Рэпарцёр.
**10.40** Капейка ў капейку.
**11.15** «Анлайн». Скетчкам.
**11.45, 17.10 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**12.25, 17.50 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**13.20, 18.50 Серыял «Кухня».**
**14.30** «Моду народу».
**15.30** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.10, 23.30 Трылер «Анёл ці дэман».**
**21.10** «Бітва экстрасэнсаў. 13-ты сезон».
**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**0.20 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».**

## Беларусь 3

**7.00** «Дабранаранак».
**7.35, 11.55, 18.45, 21.00** Навіны культуры. «Калейдаскоп».
**7.55, 17.25 «Вечны кліч». Драма. Фільм першы.**
**9.15, 20.00** «Леў Троцкі. Чырвоны Банапарт». Дак. фільм.
**9.50 «Насімі». Драма.**
**11.30** «Святло далёкай зоркі». Памяці жывапісца, заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь Івана Дмухайлы.
**12.10 «Першыя выпрабаванні». Драма.**
**15.05** «Легенды беларускай эстрады». «Верасы». «Каханне развітальны баль».
**15.35** Анталогія «Славянскага базару». «Славянскі базар у Віцебску-99».
**16.25** «СССР — музыка пад забаронай». Група «Машина времени».
**16.55** «Камертон». Оперны спявак, народны артыст СССР Віргіліус Нарэйка.
**19.00** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**19.05** «У гасцях у Барыса Аверына».
**20.40** «Калыханка».
**21.15** «Час кіно».
**21.25 «Смерць веласіпедыста». Драма.**
**22.50** «Мелодыі лета». Песні нашага стагоддзя. Лідзія Чабаксарава і Яўген Быкаў.

## Беларусь 5

**8.00, 19.10, 21.55** Пра спорт. Навіны.
**8.10** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — «Сібір» (Новасібірск).
**10.05** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Юнацтва» (Мінск) — ХК «Гомель».
**12.00, 19.50, 22.05** Тэніс. Турнір WTA. Токіа. 1/4 фіналу.
**18.10** Фактар сілы.
**18.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**19.20** Піт-стоп.

## АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.20** «Адваротны адлік». «Легенды і былі беларускага біятлона».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Час пакажа».
**16.20 Камедыя «Па запалкі».**
**18.20** «Чакай мяне. Беларусь».
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.05** «Голас». Новы сезон.
**23.00 Драма «Духless».**
**1.00** Начныя навіны.

## СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Мінщчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.40** «Тайны Чапман».
**9.30, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.40** «Сямейныя драмы».
**11.35** «Не хлусі мне!»
**12.35, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** «Дзіўная справа».
**15.40 «Следакі». Серыял.**
**16.10** «Аўтапанарама».
**16.50** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**17.10** «Ведай нашых!»
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** 1/4 фіналу Міжнароднай лігі КВЗ.
**22.05** «Глядзець усім!»
**23.00** Дакументальны праект: «Зялёны саляры».
**23.55 Маст. фільм «Прарок»**
**2.30** «Зорны рынг». Дайджэст.

## МІР

**6.00, 1.10** «Экстрасэнсы. Па той бок іншага свету».
**6.30, 5.00** М/ф.
**7.00** «Добрай раніцы, свет!»
**9.00 Маст. фільм «Сардэчна запрашаем, або Староннім уваход забаронены!»**
**10.25 Маст. фільм «Лекцыі для хатніх гаспадынь».**
**12.30** «Цяжар абеду».
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15 Серыял «Маша ў законе-2».**
**16.20** «Сакрэтныя матэрыялы».
**17.20, 1.40 Серыял «Таварышы паліцэйскія».**
**19.20 Серыял «Восеньскія кветкі».**
**23.05 Маст. фільм «Адзінокім даецца інтэрнат».**
**0.45** Дак. серыял «Зямля. Тэрыторыя загадак».
**3.15 Маст. фільм «Волга-Волга».**

## РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Пакой смеху».
**12.00** «60 хвілін». Ток-шоу .
**13.15** «Правілы жыцця».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.30 Серыял «20 гадоў без кахання».**
**19.10, 20.40 Серыял «Каменская».**
**21.45, 23.10** «Ізмайлаўскі парк». Вялікі гумарыстычны канцэрт.
**23.45 Маст. фільм «45 секунд».**

## НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00** «Новая раніца».
**8.30** «Студыя Юліі Высоцкай».
**9.00 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.25 Серыял «Дэльта. Працяг».**
**12.00** Суд прысяжных.
**13.20** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**13.55** «Тайны следства».
**14.25 Серыял «Бывай, «Макараў»!»**
**15.20** «Агенцтва схаваных камер».
**16.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.00** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.35** «Экстрасэнсы супраць дэтэктываў».
**21.05 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч».**
**22.45** «Большасць». Ток-шоу.
**23.55** «Таямнічая Расія».

## 8 канал

**7.00, 14.30, 19.20, 21.05, 23.55** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.20, 14.35 Камедыя «Жаніх напракат».**
**8.45, 18.10 Серыял «Тытанік».**
**9.45 Серыял «Маскоўская сага».**
**11.00 Драма «Кэрал».**
**13.00 Фантастыка «Гравітацыя».**
**14.25, 16.25, 18.00, 19.10, 21.00** «Хатняя крама».
**16.30** «Адшукваецца адпачынак».
**17.00** Дак. фільм «Лік Царыцы Нябеснай».
**19.25 Серыял «Чорны спіс».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.10 Фантастыка «Паміж зоркамі».**

## ВТБ

**6.00, 16.10, 5.00** «Турбаміксер».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.20** М/ф «Фіксікі».
**7.50** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.10, 14.10** «Ералаш».
**8.30, 18.00** Серыял «Варонін».
**9.30** Серыял «Дах свету».
**10.40, 15.00, 20.20** Серыял «Два бацькі, два сыны».
**11.20, 19.10, 0.00** «Уральскія пельмені».
**11.50** Камедыя «Сэрцаедкі».
**14.20** Серыял «Апошні з Магікян 3».
**17.00, 4.30** «Лаві момант».
**17.30, 4.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**21.30** Камедыя «Малавіта».



**1.00** Скетч-шоу «Валера ТБ».
**2.00, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**2.30** Скетчкам «Студэнты».
**3.30** «Мільёны ў сетцы».

## Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.45** Навіны культуры.
**10.20** Да юбілею Наталлі Арынбасаравай. «Першы настаўнік». Маст. фільм.
**12.00** «Аляксандр Ціхаміраў. Па той бок маскі». Дак. фільм.
**12.45, 20.45** «Правілы жыцця».
**13.10** «Пісьмы з правінцыі». Троіцк (Чалябінская вобласць).
**13.40** «Дзень за днём». Серыял.
**15.10** Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
**15.50** «Сакрэты Месяца». Дак. серыял.
**16.45** «Царская ложа».
**17.25** Да 110-годдзя з дня нараджэння Дзмітрыя Шастаковіча. Сімфонія №5.
**18.20** «Андрэй Тупалеў». Дак. фільм.
**19.00** Смеханастальгія.
**19.45** 80 гадоў Эдварду Радзінскаму. «Яшчэ раз пра каханне». Маст. фільм.
**21.15, 1.55** «Дынасція без грыму».
**22.05** Па слядах тайны. «Новыя «Успаміны пра будучыню». Дак. фільм.
**22.50** Да 70-годдзя Міхаіла Кавальчука. «Лінія жыцця».
**0.00** Мастсавет.
**0.05** «Каралеўскі генерал». Маст. фільм.
**2.40** Сусветныя скарбы.

## Настальгія

**6.00** «Спяем, сябры!» з Наталляй Казялковай. Юрый Візбар. 2005 год.
**6.40, 8.40, 9.40, 13.00, 14.35, 15.40, 17.00, 20.40, 21.40, 23.00, 23.45, 0.55, 2.35, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**7.20** Маст. фільм «Алеся».
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 16.00, 4.00** «Нараджаныя ў СССР».
**11.00** «КВЗ-87-88». Трэцяя сустрэча. Каманды НГУ і 1-га ЛМІ. 1-я частка.
**12.00** «Бітламанія» з Дзмітрыем Дзібровым. 2008 год.
**13.20** Фільм-спектакль «Прачніся і спявай!» 1974 год.
**17.00** «Песня-78». 1-е аддзяленне.
**17.55** Маст. фільм «Кароль Лір».
**20.10** «Тэатральны раман». Маскоўскія тэатры ў 70-я гады...
**21.00** «Колба часу».
**22.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1970. 1-я частка. 2009 год.
**23.30** Тэлеспектакль «Выступленне Агніі Барто». 1974 год.
**0.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Антысаветчыкі». 2005 год.
**1.20** Маст. фільм «Дні лётныя».

## EuroSport 1

**3.00, 8.00, 15.00, 23.00, 2.30** Веласпорт. Энека Тур.
**4.00, 21.00** Снукер. «Мастэрс».
**6.00, 11.00, 13.00, 17.30, 0.00** Тэніс. Турнір ATP.
**9.30** Міні-футбол. Чэмпіянат свету.

## Кінакамедыя

**1.00** Камедыя «Старыя-разбойнікі».
**2.30** Меладрама «Пастка для нявесты».
**4.05** Меладрама «Каханне — гэта для дваіх».
**5.50** Камедыя «Амаль замужам».
**7.30** Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе».
**9.05** Камедыя «Сутэнёр».
**10.45** Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе 3».
**12.15** Меладрама «Лос-Анджэлеская гісторыя».
**14.00, 14.55, 15.35** Скетчкам «Паміж намі».
**14.15, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Камедыя «Парыж любой цаной».
**17.45** Камедыя «Вяселлі і іншыя непрыемнасці».
**19.30** Меладрама «Развод па-італьянску».
**21.20** Камедыя «Што, калі Санта... зноў?»
**23.00** Камедыя «Пільная двойка».

## ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.50** «Доктар І...»
**8.20, 19.00, 2.45** «Асколкі». Серыял.
**9.45, 4.30** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**11.30** «Сляпая».
**12.30** «Варажбітка».
**13.35** «Тайныя знакі».
**14.30** «Шафа».
**15.20** «Здзелка».
**15.50** «Магія ежы».
**16.50** «Рэвізора».
**17.55** «Жыццё як цуд».
**21.00** «Д'ябал носіць «Prada». Меладрама.
**23.00** «Гучная справа».
**23.55** «Каліфрэнія». Серыял.
**0.25** «Байцоўскі клуб». Трылер.

## ТБ1000

**6.10, 18.20** Прыгоды «Невераготнае падарожжа містэра Співета».
**8.10** Фэнтэзі «Лабірынт Фаўна».
**10.20** Камедыя «З 5 да 7. Час палюбоўнікаў».
**12.05** Фантастыка «Двухсотгадовы чалавек».
**14.20** Драма «Гульня з агнём».
**16.05** Драма «Непакораны».
**20.10** Драма «Баец».
**22.15** Меладрама «Джулі і Джулія: рыхтуем шчасце па рэцэпце».
**0.25** Камедыя «Шэф Адам Джонс».
**2.15** Баявік «Шпіёнскія гульні».



**4.40** Меладрама «Даверся сябрам».

## ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Меладрама «Афінскія вечары».
**8.20** Драма «Сухадол».
**10.10** Меладрама «Гараскоп на ўдачу».
**12.10** Казка «Чорная курыца, або Падземныя жыхары».
**13.30** Камедыя «За двума зайцамі».
**14.50** Камедыя «Прывід».
**16.50** Драма «Прывітанне ад Кацюшы».
**20.20** Прыгоды «Форт Рос: у пошуках прыгод».
**22.20** Камедыя «Мамы 3».
**0.10** Трылер «Уцекачы».
**0.50** Камедыя «Раскоп».
**3.20** Драма «Дэманы».
**4.35** Камедыя «Патапаў, да дошкі!»

## National Geographic

**6.00, 12.20, 18.40, 22.30** Космас. Прастора і час.
**6.45, 13.05, 20.15** Гульні розуму.
**7.10, 13.30, 5.30** Навуковыя недарэчнасці.
**7.30, 13.50, 21.00, 0.50, 3.50** Уваварванне на Зямлю.
**8.20, 4.40, 21.45, 1.35, 4.40** Эвакуацыя Зямлі.
**9.00, 16.55** Золата Юкана.
**10.05, 18.00** Непакорлівы востраў.
**10.50** Сапраўдны суперкар.
**11.35, 15.20, 19.30, 23.20, 3.05** Расследаванні авіякатастроф.
**16.10, 0.00** Паранармальнае.
**2.20** Чалавек супраць YouTube.

## Discovery

**8.00** Таргі без тармазоў.
**9.00, 15.00** Як гэта ўстроена?
**9.30** Як гэта зроблена?
**10.00, 13.00, 18.30** Склады.
**10.30, 19.00, 3.20** Багажныя войны.
**11.00, 5.30** Выжыванне без купюр.
**12.00, 4.40** Чыгунка Аляскі.
**13.30, 19.30, 2.55** Бітва за нерухомасць.
**14.00, 7.10** Пяцёрка найлепшых.
**15.30, 2.00** Махінатары.
**16.30** Стальныя хлопцы.
**17.30, 3.50** Залатая ліхаманка.
**20.00** Аляска: сям'я з лесу.
**23.00** Лясны патруль.
**0.00** Стаць мужчынам.
**1.00, 6.20** Салдаты няўдачы.
**1.30, 6.45** Беар Грылс: кадры выратавання.

## Субота, 24 верасня

### Беларусь 1

**6.25** Існасць.
**6.50, 22.05 Серыял «Ніка».**
**8.30** Буйным планам.
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Клуб рэдактараў.
**9.50 Серыял «Сваты-6».**
**11.00** 50 рэцэптаў першага.
**12.10** Дача.
**12.50** Здароўе.
**13.40, 16.25 Меладрама «Всем скорбящим радость».**
**15.15** Краіна.
**18.05, 21.40 Меладрама «Во саду ли, в огороде».**
**21.00** Панарама.
**1.25** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.05 Серыял «Класная школа».**
**8.00** «Арол і рэшка. Шопінг». Трэвел-шоу.
**9.00, 20.55** Тэлебарометр.
**9.05 Серыял «Шчаслівыя разам 2».**
**11.00 Выбар гледачоў. Анімацыйны фільм «Мадагаскар».**



**12.35** Капейка ў капейку.
**13.10** «Вялікая ілюзія на Кіпры».
**13.45** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**14.50** «Моду народу».
**15.50** «Бітва экстрасэнсаў. 13-ты сезон».
**17.55** «Чалавек-невідзімка». Рэаліці-шоу.
**19.05** «Здзіві мяне 3». Талент-шоу.
**21.10 Баявік «Місія невыканальная».**
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**23.25 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».**

### Беларусь 3

**8.00, 14.40, 17.15, 21.00** Навіны культуры. «Калейдаскоп».
**8.15 «Безыменная зорка». Меладрама.**
**10.25** «Камертон». Актрыса, заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Таццяна Ліхачова.
**10.55 «Яны змагаліся за Радзіму». Драма.**
**13.25** «Вяртанне». Дак. фільм.
**14.05** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**14.55** «Час кіно».
**15.00 «Блакітныя горы, або Неправдападобная гісторыя». Камедыя.**
**16.30, 21.20** «Засакрэчанае каханне. Зямля і неба рэзідэнта». Дак. фільм.
**17.30** «Навукаманія».
**17.55 «Біндзюжнік і Кароль». Камедыя.**
**20.40** «Калыханка».
**22.00 «Белы алеандр». Драма.**
**23.45** «Бард-парад».

### Беларусь 5

**8.00, 21.10** Пра спорт. Навіны.
**8.10** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Юнацтва» (Мінск) — ХК «Гомель».
**10.00, 15.10, 21.20** Тэніс. Турнір WTA. Токіа. 1/2 фіналу.
**12.05** Козел пра футбол.
**12.25** Піт-стоп.
**12.55** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Шахцёр» (Салігорск) — ХК «Гомель».
**16.55** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. БГК імя Мяшкова (Беларусь) — «Віве» (Польшча).
**18.40** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Масква) — «Дынама» (Мінск).
**20.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**21.20** Тэніс. Турнір WTA. Токіа. 1/2 фіналу.
**23.25** Міні-футбол. Чэмпіянат свету. 1/4 фіналу.

### АНТ

**7.00, 8.05** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 16.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**9.05** М/с «Смяшарыкі. Новыя прыгоды».
**9.25** «Здароўе».
**10.25** «Смак».
**11.00** «Ідэальны рамонт».
**11.55 Меладрама «Дажывём да панядзелка».**
**13.55** Эдвард Радзінскі. «Смерць Сталіна. Іншая версія».
**16.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**16.20** «Тэорыя змовы».
**17.20** «Удача ў дадатак!» з «Еўраоптам».
**18.05** «Хто хоча стаць мільянерам?»
**19.05** «ДОстояние РЕспублики».
**21.05** «Сёння ўвечары».
**22.35 Драма «Духless 2».**
**0.35 Маст. фільм «Жаданне».**

### СТБ

**6.00 «Фірменная гісторыя». Серыял.**
**7.30** «Анфас».
**7.45, 1.50 Дэтэктыў «Два білеты на дзённы сеанс».**
**9.25** «Рамонт па-сумленнаму».
**10.05** «Ежа багоў».
**11.00** «Мінск і мінчане».
**11.35 «Прапаршчык». Серыял.**
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**13.40 Маст. фільм «Школьны вальс».**
**15.25** «Вадзіць па-руску».
**15.50** «Вялікі горад».
**16.40** «Наша справа».
**16.55** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**18.30** «Прагнасць».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Нам і не снілася».
**22.35 «Правінцыялы». Заключныя серыі.**

### МІР

**6.00, 8.20, 3.10** М/ф.
**7.55** «Саюзнікі».
**9.00** «Вой, мамачкі!»
**9.30** «Мой лепшы сябар. Гісторыя адной зрады».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Здабытак рэспублік. Грузінская ССР».
**10.45, 23.05 Маст. фільм «Па сямейных абставінах».**



**13.15** «Цяжар абеду».
**13.45 Маст. фільм «Сардэчна запрашаем, або Старонnім уваход забаронены!».**
**16.15 Серыял «Застылыя дэпешы».**
**1.30 Маст. фільм «Цырк».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Пакой смеху».
**7.40 Маст. фільм «Белая варона».**
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.20 Маст. фільм «Пятроўка, 38».**
**13.15, 14.15 Маст. фільм «Ты заплаціш за ўсё».**
**17.00** «Суботні вечар».
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.55 Маст. фільм «Калі цвіце бэз».**
**22.30 Маст. фільм «Каханне як стыхійнае бедства».**

### НТБ—Беларусь

**5.50** «Астрапрагноз».
**5.55, 8.20 Серыял «Дарожны патруль».**
**8.00, 10.00, 14.00, 16.00** Сёння.
**8.40** «Вуснамі немаўляці».
**9.25** «Урачэбныя тайны плюс».
**10.25** «Галоўная дарога».
**11.05** «Ежа жывая і мёртвая».
**12.05** «Кватэрнае пытанне».
**13.20** «Удача ў дадатак!»
**14.15 Серыял «Бывай, «Макараў»!»**
**16.20** НТБ-Бачанне. «Рэвалюцыя «пад ключ».
**17.15** «Героі нашага часу».
**18.05** «Следства вялі...»
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**19.55** «Новыя рускія сенсацыі».
**20.50 Серыял «Пад прыкрыццём».**
**23.35** «Салтыкоў-Шчадрын шоу».

### 8 канал

**9.00, 15.45, 19.05, 21.15, 23.35** «Надвор'е».
**9.05** М/ф.
**9.45 Серыял «Тытанік».**
**10.40** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**10.50, 15.50, 18.55, 21.00** «Хатняя крама».
**11.05 Серыял «На дарозе».**
**14.30** Мультпарад.
**16.00** «Адшукваецца адпачынак».
**16.30** «Чорнае люстэрка».
**17.15, 19.10 Серыял «Каралева-нявінніца», 1-я серыя.**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Фэшн is my прафэшн».
**21.20 Драма «Пераправа».**

### ВТБ

**6.00, 4.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**6.30** «Мой тата круцейшы!»
**7.30, 13.00** «Ералаш».
**8.00** М/ф «Тры каты».
**8.15** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.30** М/ф «Гадкае качаня і я».
**9.00, 4.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.30, 5.30** «Лаві момант».
**10.00, 1.00** «Турбаміксер».
**12.00** «Новае жыццё».
**13.30, 23.50** Скетч-шоу «Валера ТБ».
**14.30** Камедыя «Малавіта».
**17.00** «Уральскія пельмені».
**18.30** Серыял «Апошні з Магікян 3».
**20.30** «Ленінградскі Stand-up клуб».
**21.30** Драма «Пампеі».
**3.30** «Дурні і дарогі».
**4.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».

### Культура

**6.30** «Еўранъюс».
**10.00** Біблейскі сюжэт.
**10.35** «Яшчэ раз пра каханне». Маст. фільм.
**12.10** «Бляск і горкія слёзы расійскіх імператрыц». Дак. серыял. 1-я серыя.
**12.35** 75 гадоў акцёру. «Ігар Ясуловіч. Акцёрскія пробы». Дак. фільм.
**13.15** Пернікавы домік. «Лялечны спраў майстры».
**13.45** «На гэтым тыдні... 100 гадоў таму. Нефрантавыя нататкі».
**14.15** Да 100-годдзя з дня нараджэння Зіновія Герта. «Фокуснік». Маст. фільм.
**15.30** Па слядах тайны. «Новыя «Успаміны пра будучыню». Дак. фільм.
**16.15** «Гульня ў бісер». «Паэзія Мікалая Гумілёва».
**17.00** Навіны культуры.
**17.30** Да 100-годдзя з дня нараджэння Зіновія Герта. «Больш чым каханне».
**18.10** «Саламяны капялюшык». Маст. фільм.
**20.20** «Рамантыка раманса». Мікаэлу Тарывердзіеву прысвячаецца.
**21.15, 1.55** «Дынастыя без грыму».
**22.05** «Джэйн Эйр». Маст. фільм.
**0.00** «Жывая прырода Індакітая». Дак. серыял.
**0.55** «Трыумф джаза».
**1.45** «У свеце баек». М/ф для дарослых.
**2.40** Сусветныя скарбы.

### Настальгія

**6.00** «Бітламанія» з Дзмітрыем Дзібровым. 2008 год.
**7.00, 8.40, 9.40, 17.00, 17.45, 19.05, 20.25, 21.50, 23.25, 0.40, 2.40, 3.40** Музычная настальгія.
**7.20** Фільм-спектакль «Прачніся і спявай!». 1974 год.
**9.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**11.00** «Песня-78». 1-е аддзяленне.
**11.55** Маст. фільм «Кароль Лір».
**14.10** «Тэатральны раман». Маскоўскія тэатры ў 70-я гады...
**15.00** «Колба часу».
**16.00, 18.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1970. 2009 год.
**17.30** Тэлеспектакль «Выступленне Агніі Барто». 1974 год.
**19.40** «Тэма» з У. Лісцьевым: «Манекеншчыцы і фотамадэлі». 1992 год.
**21.00** «Быў час». 2009 год.
**22.00** Маст. фільм «Калі дрэвы былі вялікімі».
**0.00** «Спяем, сябры!» з Наталляй Казлаковай. Юрый Візбар. 2005 год.
**1.20** Маст. фільм «Алеся».
**5.00** «КВЗ-87-88». Трэцяя сустрэча. Каманды НГУ і 1-га ЛМІ. 1-я частка.

### EuroSport 1

**4.00, 21.00, 1.00** Снукер. «Мастэрс».
**6.00, 11.00, 14.00, 17.30** Тэніс. Турнір АТР.
**8.00, 15.45, 20.00** Веласпорт. Энека Тур.
**9.30** Аўтаспорт. Серыя WTCC.
**19.00, 23.30, 2.00** Міні-футбол. Чэмпіянат свету.
**23.00** Футбол. Чэмпіянат MLS. Найлепшыя моманты.

### Кінакамедыя

**0.35** Камедыя «Касякі».
**2.10** Камедыя «Паўднёвыя моры».
**3.55** Камедыя «Цудоўная чацвёрка».
**5.30** Камедыя «Вясёлыя і загарэлыя».
**7.15** Камедыя «Лілі Давід».
**8.55** Камедыя «Два ў адным».
**10.30** Камедыя «Госць».
**12.05** Камедыя «Тупы і яшчэ тупейшы 2».
**14.10** Камедыя «Што, калі Санта..?»
**16.00** Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе».
**17.35** Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе 2».
**19.15** Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе 3».
**20.45** Меладрама «Лос-Анджэлеская гісторыя».
**22.25** Меладрама «Развод па-італьянску».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**10.10** «Хронікі маскоўскага побыту».
**11.00** «Доказ віны».
**11.35, 1.20** «Цудоўнае стагоддзе». Серыял.
**15.05** «Астэрыкс і вікінгі». Анімацыйны фільм.
**16.20** «Блокбастары».
**17.25, 4.20** «Алігарх ТБ».
**18.00** «Лэдзі знікаюць апоўначы». Дэтэктыў.
**21.25** «Рыцар дня». Баявік.
**23.20** «Каліфрэнія». Серыял.
**23.50** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**4.45** Дак. фільм.

### ТБ1000

**6.10** Меладрама «Джулі і Джулія: рыхтуем шчасце па рэцэпце».
**8.20** Фантастыка «Ева: штучны розум».
**10.05** Камедыя «Шэф Адам Джонс».
**11.55** Драма «Баец».
**14.00** Меладрама «Даверся сябрам».
**15.35** Баявік «Шпіёнскія гульні».
**17.45** Фантастыка «Спадар Ніхто».
**20.10** Прыгоды «Незвычайныя прыгоды Адэль».
**22.10** Меладрама «Яна».



**0.20** Драма «Галгофа».
**2.10** Драма «Абяцанне».
**4.05** Меладрама «Там, дзе сэрца».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Прыгоды «Форт Рос: у пошуках прыгод».
**8.20** Камедыя «Мамы 3».
**10.15** Трылер «Уцекачы».
**12.10** Драма «Дзюба-Дзюба».
**14.40** Камедыя «Раскоп».
**16.20** Драма «Я не вярнуся».
**18.25** Меладрама «Сатысфакцыя».
**20.20** Меладрама «Дзве жанчыны».
**22.15** Баявік «Мантана».
**0.10** Драма «Танкер «Танга».
**2.20** Драма «Блукаючыя».
**4.00** Мюзікл «Стылягі».

### National Geographic

**6.00, 12.30, 19.25** Космас. Прастора і час.
**6.45, 13.20** Гульні розуму.
**7.10, 13.40, 5.30** Навуковыя недарэчнасці.
**7.55** Чалавек супраць YouTube.
**10.20** Дзікі тунец.
**11.00** Сапраўдны суперкар.
**11.50, 22.30** Расследаванні авіякатастроф.
**14.05** Як перамагчы ва ўсім.
**20.10** Спецвыпуск: атамны сакрэт «Тытаніка».
**21.00, 0.50, 3.55** Другая сусветная вайна.
**21.45, 1.35, 4.40** Рэстрэпа. Аванпост у Афганістане.
**23.20** Паранармальнае.
**0.05, 2.20** Уварванне на Зямлю.

### Discovery

**8.00** Смяротны ўлоў.
**9.00** Першапраходцы.
**10.00, 2.00** Голыя і напалоханыя.
**11.00, 4.40** Паляўнічыя на рэліквіі.
**12.00** Паляўнічыя на склады.
**13.00** Стальныя хлопцы.
**14.00** Махінатары.
**15.00, 2.55, 6.20** Мяцежны гараж.
**16.00, 5.30** Вулічныя гонкі.
**17.00** Паляўнічыя на зброю.
**22.00, 7.10** Як працуюць машыны.
**23.00** Будаўнікі караблёў-гігантаў.
**0.00** Войны за малюскаў.
**1.00** Лясны патруль.
**3.50** Не спрабуйце паўтарыць.

---

## Zамор'е

### Рэкорд з барадой

**Жыхарка брытанскага горада Слау ўстанавіла сусветны рэкорд, стаўшы самай маладой уладальніцай... барады, паведамляецца на сайце Guinness World Records.**



24-гадовая Харнаам Каур працуе мадэллю. Адзначаецца, што даўжыня раслiннасці на яе твары складае больш за 15 сантыметраў. Паводле слоў дзяўчыны, у падлеткавым узросце яна пакутавала ад здзекаў у сувязі са сваёй хваробай і стала гадаваць бараду, каб справіцца з комплексамі, якія з'явіліся. У сакавіку 2016 года Каур стала першай жанчынай з барадой, якая прайшла па подыуме ў рамках Тыдня моды ў Лондане. Манекеншчыца таксама апублікавала здымак, на якім пазіруе разам з узнагародай. У подпісы да кадра яна выказала надзею, што яе прыклад акажа пазітыўны ўплыў і натхніць іншых людзей.

### Пажылы каратыст адбіўся ад мядзведзя

**Пажылы японскі каратыст выйшаў пераможцам у сутычцы з гімалайскім мядзведзем, паведамляе The Mainichi.**

63-гадовы ўладальнік чорнага пояса па каратэ рыбачыў у правінцыі Гума. Ніякай зброі ў яго з сабой не было, таму адбівацца ад мядзведзя, які выйшаў з лесу, даваўся ўрукапашную. Пасля некалькіх удараў у вобласць вачэй звер уцёк. Рыбак атрымаў траўмы ад зубоў і кіпцюроў звера, але змог дабрацца да бальніцы самастойна. Мясцовы ўрад заявіў, што мядзведзі часта знішчаюць фермы і крадуць ураджай у рэгіёне, але выпадкаў нападаў на людзей тут даўно не было. Пасля гэтага здарэння былі ўзмоцнены меры бяспекі, мясцовы паляўнічы клуб паабяцаў расставіць пасткі.

У чэрвені ў японскай правінцыі Акіта адбылася чарада нападаў мядзведзя-людаеда на мясцовых жыхароў, вядома як мінімум пра чатыры ахвяры.

### Пытанне на пяць

**Настаўнік па матэматыцы з ЗША ўключыў у экзамен дадатковае заданне на веданне свайго твару. Тым, хто выбіраў правільны здымак, выкладчык прыбаўляў адзін бал. Фотаздымак незвычайнага тэста апублікаваў на партале Reddit адзін з навучэнцаў.**



Паводле яго слоў, настаўнік матэматыкі ні разу не адзначаў прысутных, а ў дзень экзамену наогул з'ехаў з горада. У тэсце, які выдалі навучэнцам, фінальнае пытанне гучала так: «Ужо прайшло каля паловы чвэрці. І я думаю, кожны з вас павінен у нейкай меры ведаць мяне. Давайце зробім маленькую віктарыну: на якім з гэтых здымкаў я?». Правільны здымак трэба было выбраць з чатырох варыянтаў. Як адзначае аўтар публікацыі, ён паказаў сапраўднае фота выкладчыка, паколькі рэгулярна наведваў заняткі па матэматыцы. Карыстальнікі Reddit пасмяяліся з жарту настаўніка і сышліся ў думцы, што на фотаздымках адзін і той жа чалавек.

**Іван КУПАРВАС**

■ Свой стыль

# Пазнаць краіну па адзенні

## Работнікі сферы турызму адмаўляюцца ад звычайных кашуль і пінжакоў

**Персанал «Беларустурыста» хутка апране новую карпаратыўную форму з нацыянальным каларытам.**

Калі чалавек прыязджае ў краіну па справах, ён не заўсёды знаходзіць час бліжэй з ёй пазнаёміцца. На думку кіраўнікоў адзінай у Беларусі сеткі турыстычных прадпрыемстваў, новая форма супрацоўнікаў стане для бізнесмена адной з адметнасцяў, якую ён запомніць пасля візіту ў Сінявокую.

— Усе мы прывыклі, што ў гатэлях турыстаў сустракае адміністратар у дзелавым гарнітуры і ахоўнік, падобны вопраткай да міліцыянера. Безумоўна, кашуля і пінжак — нядрэнны выгляд, але нам хацелася, каб госць адразу зразумеў, што тут яго чакалі, тут яму рады. Пра гэта павінна сведчыць не толькі ўсмешка, але і ўвесь выгляд. Таму мы вырашылі аб'явіць конкурс «Адзенне і абутак карпаратыўнага стылю», які дапаможа стварыць вобраз беларускай гасціннасці. Давайце апранемся так, каб не спатрэбілася лішніх слоў, — заклікала **генеральны дырэктар турысцка-экскурсійнага прадпрыемства «Беларустурыст» Людміла СЯНЬКОЎСКАЯ.**

Мяркуецца, што эскізы новай вопраткі з'явяцца ўжо ў канцы верасня. Час правядзення конкурсу таксама выбраны не выпадкова: гэты праект стане падрыхтоўкай да 2017 года, які Генеральная Асамблея ААН аб'явіла Міжнародным годам турызму.

Старшыня канцэрна «Беллегпрам» Мікалай Яфімчык звярнуў увагу, што тавары з беларускай сімволікай набіраюць папулярнасць у замежных турыстаў, бо госці едуць у краіну пераважна па экзотыку. Ён таксама адзначыў, што канцэрн сёння мае магчымасці на стварэнне такога буйнога заказу, як пашыў карпаратыўнай вопраткі для цэлай галіны паслуг.

Паўдзельнічаць у распрацоўцы стылю для беларускага турыстычнага персаналу можа кожны дызайнер. Людміла Сянькоўская параіла майстрам знайсці творчы падыход да задачы і адмовіцца ад стэрэатыпаў. Адзінае патрабаванне — адзенне павінна змяшчаць у сабе пэўную асаблівасць, якая дазволіць адразу пазнаць супрацоўнікаў «Беларустурыста», незалежна ад іх сферы дзейнасці.

Зацікаўлена конкурсам і **адна з вядучых дызайнерак Беларусі Юлія ЛАТУШКІНА:**

— Я хачу звярнуць увагу калег на магчымасці, якія адкрывае ўдзел у распрацоўцы формы для турыстычнага сэрвісу. Для пераможцы гэта будзе адначасова і вялікая, цікавая праца, і падтрымка праверанага прадпрыемства, і пастаянныя заказы. Што тычыцца мастацкай часткі, то гасцей краіны абслугоўвае вялікая колькасць людзей: адміністратары, перакладчыкі, прыбіральшчыкі, экскурсаводы, афіцыянты, работнікі турыстычных бюро... На мой погляд, іх форма не павінна быць аднолькавай.Таму задача не проста ў стварэнні нейкага тыпу карпаратыўнай формы, а ў распрацоўцы цэлай калекцыі адзення.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.** *yurgel@zviazda.by*

■ Выстава пад адкрытым небам

# ПІРАМІДА З ВЕЛАСІПЕДАЎ

## І іншыя дзівосы ад былога гоншчыка

**Канструкцыя з колавых дыскаў, на вяршыні якой знаходзяцца сапраўдны гоначны матацыкл, брама з горных лыжаў, старыя аўтамабілі, пастаўленыя ў радок, веласіпедная піраміда... Гучыць так, нібыта я пабывала ў музеі сучаснага мастацтва і вырашыла пералічыць, што там ёсць. Не. Гэта інсталяцыі і рэчы, якія знаходзяцца на адным з падворкаў у аграгарадку Рамель, што ў Столінскім раёне.**

Стварыў гэтую незвычайную, нават экзатычную для сельскай мясцовасці выстаўку Іван Пятровіч Нагар, вядомы ў свой час савецкі гоншчык. Ён дваццаць пяць гадоў прысвяціў матаспорту, выступаў за каманду Ленінграда, быў членам зборнай СССР. Іван Нагар стаў майстрам спорту. Аднойчы, пасля чарговых спаборніцтваў у Аўстрыі, спартсмен вырашыў там застацца і выступаць за зборную гэтай краіны. На той час рашэнне было не з простых: савецкія ж часы ўсё-такі. Але пасля распаду Савецкага Саюза Іван Пятровіч змог ужо без усякіх перашкод прыязджаць на радзіму да сваёй маці. Цяпер былому гоншчыку 64 гады, ён жыве паблізу Вены.

Пачалося ўсё з веласіпеднай піраміды. Нават цяпер нікому дакладна невядома, колькі гэтых сродкаў перамяшчэння пайшло на інсталяцыю. Старыя і новыя, дарослыя і дзіцячыя, каляровыя і ржавыя — іх тут не адзін дзясятак! Веласіпеды так нанізаны і пераплецены паміж сабой, што немагчыма і палічыць. Колы, рулі, педалі — усё ў розныя бакі.

Сваю калекцыю колавых дыскаў гоншчык збіраў дваццаць гадоў. Доўгі тэрмін, але ж і дыскаў нямала — аж дзевяноста сем! Яны змацаваны паміж сабой і ўстаноўлены ў чатырнаццаць радоў. На самым версе — спартыўны матацыкл з імправізаваным байкерам у шлеме.

Неяк у буру вецер паваліў кампазіцыю, але Іван Пятровіч паставіў іх зноў на тое ж самае месца і ўмацаваў. Яшчэ да гэтага здарэння галубкі пабудавалі сабе гняздо на матацыкле, які стаіць на вяршыні з колавых дыскаў. Пасля непагадзі яны ўжо не вярталіся.

Таксама падворак упрыгожваюць дзве вялікія скрыні, якія належалі яшчэ прабабулі Івана Нагара, ім каля двухсот гадоў. Калі я глядзела на іх, то адразу ўспомніла фільмы пра піратаў. Яны заўсёды перавозілі свае рэчы і хавалі золата ў падобных куфрах.

Нельга не заўважыць і канструкцыю са шматлікіх кухонных прылад. Мабыць, не ў адной клапатлівай гаспадыні сціснулася сэрца, калі яна глядзела на «пабудову». Першая прыступачка — падвешаныя кругам патэльні. Іх тут больш за дзясятак. Выглядаюць яны так, нібы толькі што з крамы — чыстыя, бліскучыя. Я б шчыра радавалася падчас жыцця ў студэнцкім інтэрнаце, калі б мне падарылі падобную патэльню. Другая прыступка — шматлікія каструлі. Таксама на выгляд як новыя. І, крыху вышэй, у два паверхі, вісяць спачатку маленькія, а потым вялікія чыгункі. Менавіта яны лічацца неад'емнай часткай кухоннага начыння вясковай жанчыны, таму што ў кожным доме ёсць печ, дзе гатуюць стравы ў гліняных гаршках і ў чыгунках. Ежа атрымліваецца смачнейшая, чым прыгатаваная на газавай пліце.

Сем старых машын і тры матацыклы стаяць у радок. Некаторыя падобныя аўтамабілі неяк мне даводзілася бачыць на выстаўцы ў музейным комплексе старадаўніх рамёстваў «Дудуткі», што недалёка ад Мінска. Яшчэ чатыры машыны стаяць па вертыкалі, утвараючы нібы аўтамабільную гару, на вяршыні якой ляжыць вялікае кола з трактара.

На падворку, дзе знаходзіцца экспазіцыя, раней быў дом, але ён згарэў. Каб месца не пуставала і не нагадвала аб непрыемным здарэнні, Іван Пятровіч знайшоў вось такі цікавы спосаб. Былы гоншчык цяпер на пенсіі, але не можа сядзець без справы. І, калі прыязджае ў родную вёску, узводзіць падобныя «экспанаты» з рэчаў, якія назбіраліся. Гэтая выстава лічыцца знакам адрознення і пазнавання вёскі ва ўсім раёне, а незвычайныя «канструкцыі» застаюцца ў памяці любога чалавека, які ўпершыню праязджае па рамельскай вуліцы.

**Марына ЛЯШКЕВІЧ,** *Столінскі раён*





■ Неасабісты суб'ектыў

# ВЯРБЛЮД/БАМБУК

## Памятка для тых, хто сабраўся ісці на «эксклюзіўную прэзентацыю»



За акном ужо была густая цемра, прыпраўленая вязкім туманам, гадзіннік паказваў амаль палову дзявятай. Нумар быў падпісаны, усе думкі былі за межамі кабінета і мітусіліся ад смачнай ежы да мяккай канапы... Раптам на стале зазваніў тэлефон — рэзка так, настойліва, ён не пакідаў сумненняў, што трэба абавязкова зняць трубку, што там, на тым канцы проваду, камусьці штосьці вельмі патрэбна, раз званяць у рэдакцыю ў такі час. «Добры дзень. Мяне завуць Тамара. Я маю гонар запрасіць вас на прэзентацыю эксклюзіўнай французскай бялізны, якая адбудзецца заўтра ў рэстаране такім-та. Ваш тэлефонны нумар быў выбраны метадам электроннай латарэі, таму вам вельмі пашанцавала. На прэзентацыі чакаюцца фуршэт і падарункі. Я вас зараз унясу ў спісы. Як ваша імя? Дарэчы, у вас унікальны бонус — вы можаце прыйсці на прэзентацыю з сябрам ці сяброўкай...»

Я падчас усёй гэтай тырады нават рот не паспела раскрыць. Ветлівая невядомая Тамара перла напралом, як цяжкі танк. Калі ж нарэшце яна змоўкла, рыхтуючыся запісаць імя маё і сяброўкі, якую я абавязкова прывяду з сабой, я, прызнаюся, не вельмі ветліва паведаміла ёй, што яна дарэмна змарнавала час, і параіла праверыць іхнюю «электронную латарэю», бо пазваніла яна не на кватэру, а ў сур'ёзную ўстанову, дзе людзі працуюць, а не дурнотай займаюцца. Тамара ледзь не басам злосна буркнула «прабачце» і паклала трубку.

Нешта ў Тамары ў той дзень не заладзілася, калі яна са сваімі прапановамі званіла позна ўвечары, ды яшчэ не на кватэрны нумар. Звычайна гэтыя «лаўцы чалавекаў» тэлефануюць у будны дзень дзесьці пад абед, калі дома застаюцца іх патэнцыяльныя кліенты — хатнія гаспадыні, «адпускнікі», якім не выпала нікуды з'ехаць, цікаўныя пенсіянеркі... Як паказвае ўласны досвед (дакладней, не ўласны, а адной такой цікаўнай пенсіянеркі, якая хутка прыедзе з летняга сезона на зімоўку), звоняць ледзь не кожны дзень з зайздросным пастаянствам. І гэта пры тым, што мама, строга мной навучаная, усім гэтым тамарам жаласліва так адказвае: «А дзіцятка ты маё, куды ж я пайду, я дурная вясковая баба, з хаты баюся выйсці...» (Мы пасля ўвечары шчыра з гэтага рагочам). Але назаўтра чарговая тамара звоніць зноў, зноў запрашае на «эксклюзіўную прэзентацыю». Выходзіць, іх у Мінску шмат, абсалютна паміж сабой не звязаных. Сапраўдная сетка. І назва ў яе адпаведная — сеткавы маркетынг.

Мая прыяцелька нядаўна, седзячы трэці тыдзень у адпачынку і з'язджаючы з глузду ад няма чаго рабіць, на такую прапанову адгукнулася. Пайшла ў рэстаран (дарэчы, прыстойны і нятанны, чым і спакусілася) на прэзентацыю «пасцельнай бялізны новага пакалення». Вярнулася крыху збянтэжаная, з дзвюма прамавугольнымі падушкамі (адну з якіх тут жа распрабавала мне прадаць). Падушкі тыя, як захоплена пачала мне расказваць, не простыя, а гаючыя. І ад бяссонніцы дапамогуць, і ад з'яўлення другога падбародка, і ад павышанага ціску, і ад скрыўлення пазваночніка. Слухаючы ўсю гэту рэкламную ахінею, я круціла ў руках цуда-тавар, набіты (як здалося навобмацак) ці то саломай, ці то пілавіннем, на абгортцы якога было напісана загадкавае: «Вярблюд/бамбук». «Дык усё-ткі тут бамбук ці вярблюд?— перабіла захопленыя спіч сяброўкі. — Не, мне гэткі мікс не падыходзіць». Тая падхапіла чароўныя падушкі і, пакрыўджаная, пайшла.

Патэлефанавала праз два тыдні — рагоча, аж заходзіцца. «Слухай, дакладна магу сказаць: там бамбук. А можа, што іншае, але дакладна дрэва! Трэскі ўжо павылазілі!» Мы з ёй пасля ў кавярні сітуацыю па дэталях разабралі. У тым дарагім рэстаране, дзе прэзентацыя была, уласна ад рэстарана былі толькі сталы ды сцены. На сталах стаялі бутэрброды і кола ў пластыкавых кубачках. Дзяўчаты, што прэзентавалі тавар, былі ветлівыя, але настойлівыя («Вы толькі патрымайце ў руках, адчуйце, як гэта зручна, ад яе, здаецца, нават цяпло ідзе»). Падобныя падушкі яна ўжо бачыла: прадавалі цыганкі ў пераходзе, прычым удвая танней. Але ж нават у галаву не прыйшло іх купіць! «Не ведаю, як насланнё найшло. Можа, яны якім гіпнозам валодаюць?»

Давайце ўгадаю: у кожнага з тых, хто чытае гэтыя радкі, у хаце знойдзецца якая-небудзь непатрэбная і абсалютна бескарысная трасца. Штопар, які не адкаркоўвае бутэлькі, тарка, на якой і сыр не падзярэш, патэльня, «непрыгаральнае» пакрыццё якой уздзьмулася пры першым жа награванні... І купілі вы ўсё гэта добраахвотна ў прыемных усмешлівых людзей, якія адчынялі дзверы ў кабінет або кватэру з радасным: «Добры дзень! Віншую вас! Вам пашанцавала: у нас сёння акцыя...» (Пра «гербалайф» згадваць тут не буду, хоць нядаўна са здзіўленнем даведалася, што фірма гэта жыве і квітнее: нядаўна ў Мінску арандавалі адну з самых вялікіх залаў пад правядзенне міжнароднага сходу.) Цяпер «карабейнікі» перасталі займацца пакватэрным абходам, перайшлі на абзвон і на калектыўныя прэзентацыі. Але працуюць усё па тым жа прынцыпе, з той жа мэтай — уперці вам, ды падаражэй, непатрэбшчыну, цана якой насамрэч — капейкі. Дзейнічае цэлы сіндыкат, і прыцягнуць да адказнасці іх ніхто не можа. Па крымінальнай класіфікацыі на махлярства гэта дзейнасць не цягне: людзей жа не дураць, яны ж маюць магчымасць памацаць, панюхаць, на зуб пакаштаваць тое, што набываюць...

Вось у гэтым і галоўны сакрэт поспеху сеткавага маркетынгу. Яго спецыялісты працуюць па адмысловай методыцы, у якой прапісана ўсё: пачынаючы ад таго, як вітацца, запрашаючы на прэзентацыю, колькі хвілін гаварыць па тэлефоне, і заканчваючы тым, як угаварыць кліента купіць не адзін тавар, а два. Асноўны пастулат гэтай навукі: абавязкова даць патэнцыяльнаму пакупніку патрымаць тое, што трэба прадаць, у руках. Нават калі рэч зусім не патрэбна, у ахвяры на ўзроўні падсвядомасці спрацуе інстынкт уласніка, яна ўжо не захоча выпускаць яе з рук. Методыка абяцае 95 працэнтаў поспеху. Дадайце сюды ўжо ўласна наша, нацыянальнае «Няёмка, чалавек тут так стараўся, як жа яго пакрыўдзіць, нічога не купіўшы...» — атрымаецца і ўсе сто працэнтаў. Вось вам і ўвесь «гіпноз».

Цікава, калі б наладзіць распродаж цуда-сродку для мазгоў, які дапамагае не быць абдураным, — вынік быў бы той жа?..

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки»,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| Продавец | **УП «СВ КЛАСС»,** Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 142-Г |

**Предмет аукциона**

| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|
| **Лот №1** | | | |
| **Здание бондарно-сушильного цеха** | 1922,3 | 710/С-15670 | г. Бобруйск, ул. Рогачевская, 37Б |
| Составные части и принадлежности: пять пристроек | | | |
| Сведения о земельном участке: **пл. 0,4413 га**, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания производственного здания | | | |
| **Начальная цена с НДС – 240 976 руб. 00 коп. (снижена на 20%)** (2 409 760 000 бел. руб.) | | | |
| **Лот №2** | | | |
| **Здание мебельного производства** (здание неустановленного назначения) | 852,5 | 710/С-4252 | г. Бобруйск, ул. Минская, 142А/15 |
| Составные части и принадлежности: пилорама | | | |
| Сведения о земельном участке: кадастровый номер 741000000001000394 (присвоен предварительно) | | | |
| **Начальная цена с НДС – 116 558 руб. 64 коп. (снижена на 20%)** (1 165 586 400 бел. руб.) | | | |
| **Лот №3** | | | |
| **Здание склада химматериалов** (здание нежилое) | 1392,9 | 710/С-39960 | г. Бобруйск, ул. Минская, 142Д |
| Сведения о земельном участке: **пл. 0,2528 га**, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания здания склада химматериалов | | | |
| **Начальная цена с НДС – 288 816 руб. 00 коп. (снижена на 20%)** (2 888 160 000 бел. руб.) | | | |
| **Лот №4** | | | |
| **Здание электроцеха** (здание нежилое) | 717 | 710/С-41163 | г. Бобруйск, ул. Минская, 142Г |
| Составные части и принадлежности: пристройка | | | |
| Сведения о земельном участке: **пл. 0,0589 га**, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания здания электроцеха | | | |
| **Начальная цена с НДС – 158 816 руб. 88 коп. (снижена на 20%)** (1 588 168 800 бел. руб. ) | | | |
| **Лот №5** | | | |
| **Подсобное хозяйство** | 1223 | 710/С-4251 | г. Бобруйск, ул. Минская, 142К |
| Составные части и принадлежности: с шестью пристройками | | | |
| Сведения о земельном участке: **пл. 0,4575 га**, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания зданий и сооружений производственного назначения | | | |
| **Начальная цена с НДС – 120 808 руб. 00 коп. (снижена на 20%)** (1 208 080 000 бел. руб. ) | | | |
| **Обременения** | Арендаторы. Подробная информация на сайте организатора аукциона | | |

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с №3012343260010 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** по лотам №№ 1–3: 10 (десять) рабочих дней после согласования проекта договора купли-продажи с залогодержателем, в связи с наличием обременения в пользу ОАО «Белинвестбанк» (ипотека). По лотам №№ 4, 5: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона. **Условия оплаты:** если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано **газете «Звязда» от 03.08.2016**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

**Аукцион состоится 05.10.2016 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 03.10.2016 до 17.00** по указанному адресу. **Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-183-69-71. www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by**

## РЕЗУЛЬТАТЫ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ
# «Выиграй мультиварку!»

**Организатор рекламной игры**: Закрытое акционерное общество «Минский транзитный банк», УНП 100394906, зарегистрировано Национальным банком Республики Беларусь 14.03.1994 г., регистрационный номер 38, лицензия №13 от 06.05.2013 г., выдана Национальным банком Республики Беларусь.

Юридический адрес Организатора: 220033, Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Партизанский, 6а. Местонахождение Организатора: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Толстого, д. 10, пом. 319.

**Наименование рекламной игры**: «Выиграй мультиварку!»

**Территория проведения рекламной игры**: Республика Беларусь.

**Сроки проведения рекламной игры:** с 30 июня 2016 года по 07 октября 2016 года.

**Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры**: № 2782 от 20 июня 2016 года выдано Министерством торговли Республики Беларусь.

**Количество участников рекламной игры:** в игре приняло участие 7 (семь) человек.

Призовой фонд рекламной игры «Выиграй мультиварку!» разыгран не полностью.

**Победитель, выигравший мультиварку Lumme LU-1446 (белый/сталь):**

1. Серединская Светлана Ивановна, д. Козловичи, Слуцкий район, Минская область.

**Победители, выигравшие мультиварку Lumme LU-1446 Chef Pro (белый/сталь):**

1. Микидон Андрей Георгиевич, г. Слоним;
2. Шагинова Елена Александровна, г. Могилев;
3. Ширшов Дмитрий Анатольевич, г. Барановичи.

Мультиварка Lumme LU-1446 (белый/сталь) во втором розыгрыше (г. Полоцк), мультиварки Lumme LU-1446 Chef Pro (белый/сталь) в четвертом (г. Гродно), пятом (г. Орша), восьмом (г. Жлобин) розыгрышах разыграны не были.

**Телефоны для справок по вопросам проведения рекламной игры: +375(29) 509 99 99, +375(44) 509 99 99, +375(25) 509 99 99 круглосуточно.**

Полные Правила рекламной игры были опубликованы в газете «Звязда» 29.06.2016 г. № 122 (28232).

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| Наименование (описание) и стоимость имущества | |
|---|---|
| | **Лот №1.** Лебедка электрическая ЛМ-2 в комплекте (втулка, канат, крюк) № инв. 4995.<br>Первоначальная стоимость – 780 рублей без учета НДС.<br>**Лот №2.** Керамзитовый песок в количестве 15 тонн.<br>Первоначальная стоимость – 961 рубль 48 копеек без учета НДС.<br>**Лот №3.** Жидкое стекло в количестве 250 кг.<br>Первоначальная стоимость – 961 рубль 48 копеек без учета НДС.<br>**Лот №3.** Линия по производству ЦПЛ длиной около 36 м, состоящая из:<br>- вибратор ИВ99Б<br>Первоначальная стоимость – 16 рублей без учета НДС;<br>- компрессор 0,4 м³/час.<br>Первоначальная стоимость – 98 рублей без учета НДС;<br>- металлоконструкций (конвейер с бункером, формовочно-отрезной станок, каркас камеры ТВО, рельсы для грузовых тележек, грузовые тележки) в количестве 2, 968т.<br>Первоначальная стоимость – 247 рублей без учета НДС.<br>**Лот №4.** Пневмонагнетатель ПН-900.<br>Первоначальная стоимость – 796 рублей 48 копеек без учета НДС.<br>**Лот №5.** Каркасное сборно-разборное здание, состоящее из основных строительных материалов, в том числе: раствор – 0,966 $м^3$; лист ЛЦП – 109,59 $м^2$; брус (каркас) – 1,247 $м^3$; профнастил – 57 $м^2$; брус (кровля) – 0,405 $м^3$; доска обр. – 0,528 $м^3$; блок дверной – 1 шт.<br>Первоначальная стоимость – 1904 рубля без учета НДС. |

| | |
|---|---|
| **Собственник (владелец) имущества** | ООО «ОршаКЕМБел», УНН 391138673 |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | г. Орша, ул. Ленина, 234Р |
| **Информация об обременениях** | Без обременений |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | г. Орша, ул. Островского, 36, каб. 1<br>14 октября 2016 года в 11.00 |
| **Справочная информация** | Отдел принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши, 211030, г. Орша, ул. Островского, 36<br>Главный специалист – Маханькова Анастасия Александровна, тел. 80216543202, 80336161412.<br>Начальник отдела – Павлюченкова Наталья Евгеньевна, 80216543213.<br>Заместитель начальника отдела – Дубкевич Ольга Леонидовна, 80216543205, 80336878908 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши № 3642903000794 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 647, УНП 30002505, не позднее **13.10.2016 г. до 11 часов.**<br>Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота.<br>В соответствии с ч. 3 ст. 401 ХПК Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

## Открытое акционерное общество «Минский домостроительный комбинат»,

**расположенное по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 43,**
**извещает акционеров о том, что 27 сентября 2016 г. в 15.00 в актовом зале предприятия состоится**
**ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**
1. О начислении и выплате дивидендов за первое полугодие 2016 года.
2. О внесении изменений в Устав Общества.

С проектами решения собрания акционеры могут ознакомиться в рабочие дни начиная с 21 по 26 сентября 2016 года по месту нахождения Общества (производственно-технический отдел, 2-й этаж).

Регистрация участников собрания будет проводиться в актовом зале предприятия **с 14.30 до 15.00**.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – нотариально заверенную доверенность).

УНП 100258980

## Коммунальное унитарное предприятие «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

Минский городской центр недвижимости

